РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 КРАСАВІКА 2025 г. АЎТОРАК № 73 (30461)

# «МЫ НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫЯ ЛЮДЗІ Ў ПЛАНЕ ЛЮБОВІ ДА СВАЁЙ РАДЗІМЫ»

**Зямная праца і зямная размова — як правёў суботнік кіраўнік дзяржавы**

12 красавіка ўся краіна выйшла на рэспубліканскі суботнік. А разам з ёй і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы працаваў на пляцоўцы, якая пастаянна знаходзіцца ў полі яго зроку — на будаўніцтве Нацыянальнага гістарычнага музея і Парка народнага адзінства. Новы комплекс упрыгожыць патрыятычны ансамбль сталіцы, побач з ім, як вядома, размешчаны Палац Незалежнасці, Вярхоўны суд і плошча Дзяржаўнага сцяга.












СТАР. 3–4

ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ 13



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

# УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ — ПАД ДЗЯРЖАЎНЫМ КАНТРОЛЕМ

У Беларусі створана дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі ў 2025 годзе. Адпаведны ўказ нумар 152 падпісаў 14 красавіка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Старшынёй камісіі назначаны намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Каранік. У склад камісіі ўключаны прадстаўнікі Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў, органаў дзяржаўнага кіравання, кантралюючых органаў і грамадскіх арганізацый.

Рэалізацыя ўказа дасць магчымасць забяспечыць абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прымаць у выпадку неабходнасці аператыўныя меры рэагавання для выключэння парушэнняў заканадаўства.

# «КАЛІ МІНСК ВЫТРЫМАЕ ТЭМПЫ — ЗНАЧЫЦЬ, І Ў КРАІНЕ БУДЗЕ НЯДРЭННА»

**Якія задачы трэба вырашаць сталіцы, Прэзідэнт абазначыў на сустрэчы з мэрам**

Новы рабочы тыдзень кіраўніка дзяржавы пачаўся з актуалізацыі задач па развіцці сталіцы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Мінскага гарвыканкама Уладзіміра Кухарава. Мінск задае тон усёй краіне, таму ўсе аспекты развіцця сталіцы знаходзяцца ў полі зроку і пад пільным кантролем кіраўніка дзяржавы.



## ЭКАНОМІКА, ДАЎГАБУДЫ, ВОДААДВЯДЗЕННЕ

І найперш — эканоміка. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што па выніках 2024 года валавы рэгіянальны прадукт Мінска склаўся на ўзроўні 105,5 %, што больш як на трэць фарміруе агульнарэспубліканскі паказчык ВУП. Інвестыцыі сталіцы складаюць каля 22 % ад рэспубліканскіх паказчыкаў. Інвестыцыі ў асноўны капітал склаліся на ўзроўні 119 %, заработная плата вырасла амаль на 20 %. «Усё быццам бы нядрэнна, — ацаніў Прэзідэнт. — Квартал пражылі. Перспектывы? Што мы ўбачым у гэтым годзе?» Ён заўважыў, што паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінска за мінулы год і першы квартал гэтага года дазваляюць меркаваць, як у цэлым сітуацыя будзе складвацца па краіне.

**«Калі Мінск вытрымае тэмпы — трэць, нават больш, ВРП ад узроўню рэспублікі, — значыць, і ў краіне будзе нядрэнна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на найбольш актуальныя тэмы для сталіцы. Сярод іх, напрыклад, функцыянаванне сістэмы парковак у Мінску і будаўніцтва жылля. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што было прынята рашэнне будаваць пераважна за межамі сталіцы, каб не перагружаць горад і не ствараць праблемы для мінчан. Ён пацікавіўся, як ідуць справы ў гэтым кірунку. Беларускі лідар зрабіў акцэнт на праблеме звышнарматыўных тэрмінаў будаўніцтва і нагадаў, што даўгабуды — гэта недапушчальна: «У вас іх 13, з іх у «Мінск-Свет» — 8. Гэта ўвогуле недапушчальна. Яны прыйшлі сюды працаваць, заключылі з намі інвестыцыйныя пагадненні, дагаворы, узялі на сябе абавязацельствы. Няхай выконваюць, калі хочуць працаваць тут».

Яшчэ адна праблема мегаполіса — у функцыянаванні сістэм водаадвядзення. «У нас палова сетак эксплуатуецца са звышнарматыўнымі тэрмінамі. Не хачу сказаць, што гэта ўжо развалюхі, але планава трэба працаваць. Работа вядзецца. Як вы бачыце, трэба яе па аб'ёме павялічваць ці нармальна?» — запытаў ён.

Падчас наведвання Мінскага гарадскога тэхнапарка, які дзейнічае на базе Мотавелазавода, Аляксандр Лукашэнка даручаў распаўсюдзіць падобны досвед задзейнічання плошчаў па ўсім горадзе. Ён пацікавіўся, як выконваецца гэтае даручэнне.

## «УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ У ПАРАДКУ!»

Асобная ўвага — тэме, ад якой, як заўважыў Прэзідэнт, нікуды не падзецца — добраўпарадкаванне. «Як будзе ў Мінску, так будзе па ўсёй краіне. І, Уладзімір Яўгенавіч, гэта не значыць, што мы недзе павінны вуліцы падмесці і дрэўцы высадзіць. Трэба найперш, каб за кожны квадратны метр у Мінску адказвалі канкрэтныя людзі, прадпрыемствы і арганізацыі, як мы даўно дамаўляліся», — адзначыў ён. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў Парк Перамогі, адказнасць за добраўпарадкаванне якога па даручэнні сталічных улад ляжыць на адукацыйнай установе.

**«Тое ж самае — прадпрыемствы. Я шмат разоў аб гэтым гаварыў. Вакол прадпрыемства, як вы акрэсліце ім на карце зону адказнасці, яны павінны за гэта адказваць, каб было чыста, акуратна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

Ён растлумачыў, што на патрабаванні падтрымліваць чысціню ў горадзе трэба глядзець глыбей, чым проста на ўборку: «Людзі пачуюць мяне: «вось чысціню патрабуе, лісце збіраць і гэтак далей». А калі не збіраць? Гэта ж усё гніе, і гэтая гнілата разам з усёй заразай, якая там назапашваецца, удыхаецца людзьмі».

**«Гэта здароўе людзей. Таму трэба ў чысціні і парадку ўтрымліваць не толькі сваё жыллё, але і ўсё, што навокал, у месцах грамадскага карыстання — кожны кавалак зямлі павінен быць за кімсьці замацаваны».**

Аляксандр Лукашэнка даручыў паставіць перад кіраўнікамі адміністрацый раёнаў сталіцы задачу жорстка кантраляваць наведзенне чысціні і парадку на іх тэрыторыях. «Таму што захварэе чалавек — бясплатна лечым, расходуем каласальныя грошы. Дык давайце адсюль пачынаць — пад'езды, фасады, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У нас амаль у кожным доме на першых паверхах камерцыйныя структуры ці дзяржаўныя прадпрыемствы — усё роўна, якія. Мы дамаўляліся калісьці: фасад — за імі. Мы ўжо іх не нагружаем, каб яны ўнутры жыхарам дапамагалі рамантаваць і балконы ў парадак прыводзіць — фасады няхай прыводзяць у парадак за свой кошт. Каму трэба дапамагчы — вы разберацеся, каму дапамагчы».

**Прэзідэнт падкрэсліў, што ўсе гэтыя пытанні трэба прадугледзець, каб Мінск быў яшчэ прыгажэйшым. «Тады лягчэй стане працаваць на месцах: едзьце, паглядзіце як у Мінску», — адзначыў ён.**

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што месца, на якім падчас суботніка з яго ўдзелам «збольшага займаліся добраўпарадкаваннем» у будучым будзе вельмі прыгожым. І вакол усё там павінна быць прыгожа, тым больш, што побач — рака Свіслач, водная артэрыя. «Каля яе павінен быць парадак, каб людзі маглі адпачываць. Гэта значыць, павінны быць прыняты адпаведныя меры, рашэнні, і яны павінны ажыццяўляцца», — паставіў задачу Прэзідэнт.

**— Я хачу, карыстаючыся выпадкам, усіх папярэдзіць, што ў гэтым плане мы возьмем на вельмі сур'ёзны кантроль добраўпарадкаванне ў краіне: няхай ніхто не думае, што мы аб'явілі Год добраўпарадкавання — год пройдзе, і ўсё забудзецца. Не забудзецца. Усё павінна быць у парадку: і дарогі, і дамы, і вакол прыдамовыя тэрыторыі, прадпрыемствы.**

«Усё, што не трэба — знесці, дзе трэба пабудаваць нешта, — значыць, трэба пабудаваць».

## ДЫНАМІКА НЕ ЗНІЖАЕЦЦА

Падчас даклада кіраўніку дзяржавы Уладзімір Кухараў адзначыў, што летась былі дасягнуты пэўныя вынікі, а таксама было забяспечана выкананне ўсіх даведзеных паказчыкаў. «У гэтым годзе мы стараемся не зніжаць дынаміку. Па выніках першых двух месяцаў можна сказаць, што тэмп вытрымліваецца, нягледзячы на высокую базу мінулага года. ВРП за два месяцы склаў 106,4 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Мы думаем, што такі працэнт трэба ўтрымліваць», — прывёў лічбы старшыня Мінскага гарвыканкама. Індэкс прамысловай вытворчасці склаў 108,9 %, рознічны тавараабарот — 113 %. Паказчык аптовага тавараабароту — 106,8 %. «Мы ставім задачу перад прадпрыемствамі — пошук новых рынкаў. Эканоміка горада экспартаарыентаваная, і колькасць выпускаемых тавараў патрабуе, вядома ж, пашырэння рынкаў збыту», — падкрэсліў Уладзімір Кухараў.

Пасля даклада старшыня Мінгарвыканама падрабязней расказаў журналістам, якія пытанні абмяркоўваліся ў кабінеце Прэзідэнта. Што тычыцца добраўпарадкавання горада, то Уладзімір Кухараў адзначыў, што ўжо распрацаваны адпаведны план мерапрыемстваў і прынятыя ўсе меры для іх рэалізацыі. «Абмяркоўвалася пытанне далейшай перспектывы будаўніцтва ў Мінску. На сёння ў горадзе практычна няма свабодных тэрыторый для забудовы. Але ёсць сацыяльныя абавязацельствы — гэта будаўніцтва жылля для шматдзетных, будаўніцтва сацыяльнага жылля для тых, хто мае патрэбу. І ў гэтых мэтах па даручэнні кіраўніка дзяржавы будзе рэалізаваны праект «Зялёны Бор» — мікраён на тэрыторыі каладзішчанскіх палігонаў. Адпаведны нарматыўны дакумент распрацаваны і ў бліжэйшы час будзе ўнесены на разгляд кіраўніка дзяржавы, — расказаў Уладзімір Кухараў. — Абмяркоўваліся пытанні сферы рытуальных паслуг, што для Мінска вельмі актуальна. Падыходы кіраўніком дзяржавы падтрыманы».

Мэр Мінска расказаў, што Прэзідэнт праінфармаваны аб выкананні яго даручэнняў па кантролі

за станам мастоў і пуцеправодаў у Мінску. Па яго словах, за чатыры гады адрамантаваны 22 пуцеправоды, сёлета яшчэ 5 знаходзяцца ў рамонце. А затым яшчэ 12 на працягу трох гадоў будуць рэканструяваны. «Такім чынам усе праблемныя пуцеправоды будуць прыведзены ў належны стан», — запэўніў Уладзімір Кухараў.

Кажучы пра выкананне даручэння аб стварэнні тэхнапаркаў, ён расказаў, што на адной з пляцовак на вуліцы Цэнтральнай работы ўжо вядуцца, і там жа на другой пляцоўцы — ідзе праектаванне. Адпрацоўваецца пытанне па яшчэ адной пляцоўцы — гэта тэрыторыя мясакамбіната на вуліцы Казінца. «Гэтыя праекты стануць для прадстаўнікоў бізнесу той пляцоўкай, якая дасць магчымасць прымяняць новыя тэхналогіі, развіваць інавацыйны напрамак», — адзначыў старшыня Мінгарвыканкама.

Што да сетак водаадвядзення, то мэр адзначыў, што сёння па тых нарматыўных дакументах, якія існуюць, быццам бы тэрміны эксплуатацыі гэтых сетак падыходзяць да завяршэння. Але рэгулярнае комплекснае абследаванне гэтых сістэм паказвае, што яны знаходзяцца ў належным стане, бо былі пабудаваны з чыгунных і бетонных матэрыялаў, і нейкіх сур'ёзных праблем яны не нясуць.



«У рамках правядзення рамонтных работ мы па 4 % ад агульнай колькасці такіх сістэм мяняем. Але трэба разумець, што, з улікам вялікіх дыяметраў сістэмы, вельмі цяжка ў гарадскіх умовах рабіць іх замену. Таму мы выкарыстоўваем метад рэнавацыі. Работа вядзецца сістэмная, і ніякіх праблемных аварыйных сітуацый у сістэмах водаадвядзення няма», — падкрэсліў Уладзімір Кухараў.

Старшыня Мінгарвыканкама праінфармаваў Прэзідэнта аб развіцці прасторы паркоўак. Падрыхтаваны ўжо адпаведны нарматыўны дакумент, які ўзгоднены Прэзідэнтам і ў бліжэйшы час будзе ўнесены на разгляд. «З паркоўкамі гэта вельмі сур'ёзнае пытанне. Бо ў горадзе зарэгістравана 900 тысяч машын, і 200 тысяч заязджае штодня. Для такога кампактнага горада, як Мінск, гэта сур'ёзная нагрузка. Горад вельмі шмат укладвае ў развіццё сістэм транспарту. Мы будуем метро, закупляецца электратранспарт — мы забяспечваем лагістыку. Калі ёсць жаданне ехаць у цэнтр на аўтамабілі, трэба думаць, дзе яго там пакінуць. Сёння мы не можам рабіць у цэнтры дадатковыя паркінгі, таму мы адпрацавалі сістэму па дадатковых паркавачных месцах, за якія трэба будзе заплаціць», — адзначыў Уладзімір Кухараў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

# «МЫ НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫЯ ЛЮДЗІ Ў ПЛАНЕ ЛЮБОВІ ДА СВАЁЙ РАДЗІМЫ»

***(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)***

«Музей павінен стаць своеасаблівай візітнай карткай краіны. Захапляць як сучасным архітэктурным абліччам, так і ўнутраным напаўненнем», — такую задачу паставіў Прэзідэнт у верасні на нарадзе, прысвечанай архітэктурнаму рашэнню і канцэпцыі экспазіцыі Нацыянальнага гістарычнага музея. Таму стварэнне гэтага комплексу — справа гонару для ўсёй краіны. Дарэчы, сродкі, сабраныя падчас рэспубліканскага суботніка, будуць накіраваныя менавіта на гэту будоўлю.

Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў далажыў аб праведзенай рабоце па праектаванні і пачатку будаўніцтва парку і музея. Прэзідэнт падкрэсліў, што пры ўзвядзенні аб'ектаў і здачы іх у эксплуатацыю падыходы былі комплекснымі. Ён таксама зрабіў акцэнт на тым, што матэрыялы павінны выкарыстоўвацца айчынныя, як у Палацы Незалежнасці. На гэта старшыня Уладзімір Кухараў адказаў, што менавіта такіх падыходаў і прытрымліваюцца. Прычым айчынныя не толькі матэрыялы, але і тэхналогіі. Напрыклад, плануецца будаўніцтва падземнага пераходу праз вуліцу Арлоўскую ад парка і музея да плошчы Дзяржаўнага флага. Падчас гэтай працы ажыўленая Арлоўская вуліца перакрывацца не будзе, пераход пабудуюць па тыпу метро. Такую перадавую тэхналогію беларускія спецыялісты асвоілі, калі будаваўся пераход каля гандлёвага цэнтра «Першы нацыянальны гандлёвы дом». І кіраўнік дзяржавы даручаў распаўсюджваць яе па ўсёй краіне.

У будаўніцтве музея ўдзельнічаюць і студэнцкія атрады. Іх прадстаўнікі, члены Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, перадалі Прэзідэнту капсулу з пасланнем наступным пакаленням.

Ва ўрачыстай абстаноўцы кіраўнік дзяржавы заклаў яе ў камень. Пасля чаго Прэзідэнт разам з брыгадамі студэнцкай моладзі высадзіў алею з 80 дрэў, якая дала пачатак Парку народнага адзінства. І гэта сімвалічна — 80 дрэў сімвалізуюць 80 юбілейных гадоў, што прайшлі з Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Падчас працы кіраўнік дзяржавы правёў майстар-клас для маладых людзей. Дрэва высаджваецца ў лунку і замацоўваецца калкамі. «Гэта тэхналогія пасадкі дрэў! Ідэальная тэхналогія!» — звярнуўся Прэзідэнт да моладзі. Разам з кіраўніком дзяржавы дрэвы высаджваў і яго малодшы сын Мікалай.

## ГЭТА ВЕЛЬМІ ВАЖНА ДЛЯ МОЛАДЗІ

Само месца размовы садзейнічала, каб пагаварыць аб нацыянальным гонары і захаванні памяці. У Прэзідэнта спыталі, ці хапае беларусам пачуцця нацыянальнага гонару. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што добра ведае гісторыю сваёй краіны, а вось моладзь ужо не так ёю цікавіцца. Таму такія праекты, як Нацыянальны гістарычны музей, важныя перш за ўсё для маладога пакалення, каб, як адзначыў Прэзідэнт, паказаць маладым беларусам, што «мы не Іваны, якія не памятаюць роду свайго», а народ з тысячагадовай гісторыяй. «Мы гэта ўсё забываем. Таму для моладзі гэта ўсё вельмі важна. І калі яны прыйдуць сюды, а тут будзе ярка, прыгожа, будзе вельмі годна — гэта таксама важна», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Разважаючы аб пачуцці нацыянальнага гонару, кіраўнік дзяржавы, адзначыў, што важна, каб ён не перарос у нацыяналізм. І тут галоўнае не перабраць, але беларусам гэта не пагражае. «Мы па вялікім рахунку нацыяналістычныя ў плане любові да сваёй краіны. Нічога тут страшнага няма. Мы не нацыяналісты, мы не фашысты. Мы нацыяналістычныя людзі ў плане любові да сваёй Радзімы. Але мы інтэрнацыяналісты. Мы вельмі паважаем нашых братоў: расіян, украінцаў, палякаў, іншых», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Таму, паводле яго слоў, вельмі важна акуратна выхоўваць пачуццё нацыянальнага гонару, паважаць суседзяў і ведаць сваё месца.

Прэзідэнт адзначыў, што перагібы ў нацыяналізме, як і ў эканоміцы, заўсёды прыводзяць да вайны. «Я часта задумваюся аб нашай брацкай Украіне. Што ляжала ў аснове гэтага канфлікту? Пры чым тут Расія, Пуцін і іншае? У аснове ляжала разбурэнне эканомікі. Успомніце, што было напярэдадні вайны ва Украіне — збяднелыя людзі і супербагатыя алігархі. Уся гэта несправядлівасць, людзі не ведалі, што рабіць. Ім падкінулі нацыяналізм і крайнюю форму — фашызм. Напрыклад, у Адэсе людзей палілі не іх, як яны лічылі, нацыянальнасці», — прывёў прыклад ён.



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы — людзі асаблівыя, і растлумачыў, што мае на ўвазе: «У нашай крыві ўсё перамяшана: і руская кроў, і ўкраінцы, і палякі, і яўрэі. У гэтым наша беларускасць. У гэтым асаблівасць нашага народа. І мы павінны гэта разумець».

Паводле яго слоў, трэба акуратна ісці гэтым курсам, шанаваць сваю гісторыю, адчуваць нацыянальны гонар. Але не адхіляцца. «Каб у нас было мірнае жыццё, мы высаджвалі дрэвы і будавалі музеі, куды прыйдуць нашы дзеці і ўнукі», — рэзюмаваў беларускі лідар.

## «УКРАІНА НАЎРАД ЦІ НЕКАЛІ БУДЗЕ Ў ЕЎРАПЕЙСКІМ САЮЗЕ»

У працяг думкі Прэзідэнта аб Украіне журналісты пацікавіліся, што ён думае наконт уступлення гэтай краіны ў Еўрапейскі саюз, што цяпер актыўна абмяркоўваецца. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на гэта выдзяляюцца вялікія грошы, якія ў Бруселі папросту «пілуе вялікая колькасць чыноўнікаў». «Гэта мільёны долараў. І вось яны займаюцца тым, чаго, магчыма, ніколі не будзе. Украіна наўрад ці калі-небудзь будзе ў Еўрапейскім саюзе. І вось яны пілуюць, пілуюць гэтыя гранты, якія падзялілі», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Еўрапейскі саюз — гэта адзіная палітычная і эканамічная платформа, якая праводзіць аднолькавую палітыку па розных сферах. З-за гэтага краіны губляюць сваю ідэнтычнасць, яны губляюць свой твар, а потым яны губляюць сваю эканоміку. «І куды Украіна лезе? Гэта імгненнае захапленне нявопытнага чалавека. Добры чалавек Валодзя Зяленскі, але нявопытны. Ён гэта павінен прызнаць. І калі ты чагосьці не разумееш, дык ты слухай старэйшых, слухай іншых людзей, рабі адпаведныя высновы», — заўважыў беларускі лідар.

Ён звярнуў увагу, што самае простае і разам з тым актуальнае пытанне ляжыць на паверхні: куды ў выпадку ўступлення ў Еўрапейскі саюз Украіна будзе прадаваць сваю прадукцыю, якой у іншых краінах і без таго дастаткова. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як Украіна хацела правезці праз Еўрапейскі саюз сваё збожжа, загрузіць у Польшчы зернявозы і паставіць яго Афрыцы, дзе гэтага не хапала, — еўрапейскія палітыкі гэтага не дазволілі. «Таму, перш чым туды лезці, трэба падумаць: табе гэта трэба? Гэта будзе садзейнічаць развіццю тваёй эканомікі і жыцця тваіх людзей? Яны аб гэтым не думаюць. «Вось Расія такая-сякая, яна ў аснове ЕАЭС, значыць, мы ў іншы бок! Не важна куды, у гнаявую яму, у жыжку ці куды — не важна. Галоўнае, каб адтуль. Але гэта не палітыка. Палітыку трэба будаваць зыходзячы з патрабаванняў уласнага народа. Таму Украіне ў Еўрасаюзе рабіць няма чаго. Рынкі даўным-даўно падзялілі. Іх шчасце — на нашай прасторы», — заявіў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што Украіна разам з Беларуссю, Расіяй і Казахстанам пачала распрацоўваць канцэпцыю еўразійскага супрацоўніцтва, сумесна было прынята шмат важных законаў, але Украіна пайшла іншым курсам. Потым, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, украінскаму кіраўніцтву «падсунулі нацыяналістычную ідэалогію», што ў выніку і прывяло да вайны.

«Вайну спынім. Загінула шмат людзей, тысячы. Гэта дрэнна, гэта цяжка. Але мы не такую вайну перажылі. Аднак калі ты яшчэ ў гэты момант абрынеш эканоміку — усё, Украіны не будзе. Таму, перш чым туды бегчы, падумай: ты там патрэбны ці не. А калі патрэбны, які ты там будзеш патрэбны? Гэта будзе краіна без прамысловасці, без сельскай гаспадаркі, без таго, чым Украіна заўсёды ганарылася», — заўважыў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што ў савецкі час Украіна лічылася жамчужынай, якая ўражвала сваёй прыгажосцю і людзьмі. «Усё разбамбілі, знішчылі. І народ працавіты. Які Еўрапейскі саюз? Гэта найвялікшая краіна, па памерах падобная да Францыі. Найбагацейшая. Таму трэба было развівацца на ўласнай аснове», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Ён заўважыў, што нават калі Украіну прымуць у Еўрапейскі саюз, яна не зможа развівацца самастойна. «Хіба гэта развіццё, калі табе пальцам паказваюць, што ты павінен развіваць, а што не? Усё ж будзеш узгадняць», — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар.

## «ДАВАЙЦЕ ПАЧАКАЕМ...»

Журналісты задалі Прэзідэнту пытанне, якое, напэўна, хвалюе многіх беларусаў — як на цэны паўплывае вайна пошлін, якую развязалі ЗША. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што асцярога таго, што за-за росту пошлін у адной краіне вырастуць цэны ў іншай — гэта крыху павярхоўны погляд. Ён растлумачыў, што прамой узаемасувязі паміж пошлінамі ЗША і цэнамі ў Беларусі няма. «Амерыканцы паднялі пошліны на тавары, якія па імпарце ўвозяць. А ўвозяць шмат. Іх ВУП прыкладна 25 %, з улікам долара і іншага. Вядома, яны малайцы, але гэта чвэрць, а не 75 %. І ты з усім светам уступіў у вайну!» — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што спачатку Дональд Трамп заявіў аб намеры падняць пошліны на амерыканскія тавары па ўсім свеце, а потым ад сваіх жа слоў і адышоў. Словы эмацыйныя, а рашэнні непаслядоўныя. «Хіба гэта палітыка?» — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў пра сваю пазіцыю, агучаную ў інтэрв'ю МТРК «Мір», у якім таксама абмяркоўвалася гэта тэма: «Давайце пачакаем. Не будзем бясіцца».

**Заканчэнне на стар. 4 ►**

# «МЫ НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫЯ ЛЮДЗІ Ў ПЛАНЕ ЛЮБОВІ ДА СВАЁЙ РАДЗІМЫ»

***(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3)***



«Гэта фантом. Вось ён ляпнуў языком, а потым падумалі, падумалі: не, нешта небяспечнае. Дык перш чым ляпаць языком, ты ж падумай. Там шмат разумных, талковых людзей, якія палічаць і скажуць: гэта можна рабіць, гэта нельга, а калі павышаць, то трэба спачатку перагаварыць», — заўважыў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што з некаторымі краінамі, напрыклад з Кітаем, увогуле небяспечна ваяваць, кітайцы спачатку трывалі, а потым паднялі свае пошліны. Вось гэта гандлёвая вайна.

«Цяжка будзе зараз на амерыканскім рынку камусьці прадаваць прадукцыю — бар'ер вельмі высокі. Куды? Па ўсім свеце яна будзе расцякацца, у тым ліку і да нас. І нехта будзе канкурыраваць па імпартнай прадукцыі на нашым рынку. Ад гэтага цэны не растуць, таму не факт, што цэны з-за гэтага могуць вырасці. У Злучаных Штатах Амерыкі — так, у Кітаі — так. Можа быць, па нейкіх таварах гэта дойдзе і да нас. Але я неяк па-сялянску сказаў: давайце не будзем спяшацца, паназіраем і пачакаем, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы, не спяшаючыся, будзем займацца тым, чым займаемся. Мы перажылі і перажываем з Расіяй разам такія бар'еры і пошліны, санкцыі, што далей ужо няма куды. Таму асабліва парыцца наконт гэтага не варта. А прывядзе гэта да росту цэн або не прывядзе — паглядзім».

## «Я ХАЧУ, КАБ БЫЛА СПРАВЯДЛІВАСЦЬ. ГЭТА СУТНАСЦЬ СЛАВЯНСТВА»

Па словах кіраўніка дзяржавы, у Беларусі хапае ведаў і ўменняў, каб не загінуць з-за гандлёвых войнаў і выстаяць. Ён падкрэсліў, што рашэнне ўзяцца за цэнаўтварэнне ў Беларусі было правільным і мудрым. «Да чаго гэта прывяло? Перш за ўсё нашы вытворцы, асабліва вельмі разумныя бізнесмены, зразумелі, што працэс пад кантролем, свавольнічаць нельга — спытаюць, а то і пасадзяць, шчыра кажучы. Таму, хлопцы, давайце ў гэтай сітуацыі спакойна разам выпрацуем справядлівыя паводзіны на рынку», — сказаў Прэзідэнт.

**Ён зрабіў акцэнт на тым, што такі падыход не накіраваны на знішчэнне бізнесу. Прыватны сектар фарміруе значную долю бюджэту. «Навошта забіваць курыцу, якая нясе залатыя яйкі? Я ж гэта цудоўна разумею. Таму я хачу, каб людзі займаліся прадпрымальніцтвам, нешта стваралі, рабілі і іншае, але не перашкаджайце іншаму. Не выцягвайце апошняе з тых, хто стварыў нам гэту краіну, з таго пакалення, якое сёння на пенсіі, настаўнікаў, урачоў...» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.**

Па яго словах, калі дзяржава стала кантраляваць працэс цэнаўтварэння і патрабаваць забяспечыць справядлівы падыход, некаторыя ў гандлі паспрабавалі «хімічыць». Напрыклад, некаторыя нават не дырэктары, а заснавальнікі буйных гандлёвых сетак рознымі шляхамі выплачвалі сабе вялізныя грашовыя ўзнагароды. «Трэба сумленна, справядліва і падаткі плаціць, і людзям сваім плаціць, якія на цябе працуюць... Я хачу, каб была справядлівасць. Гэта крыху разыходзіцца з тым, як развіваюцца асобныя і вядучыя краіны свету. Гэта іх справа. Але ў нашага народа ў свядомасці справядлівасць. Гэта сутнасць славянства», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## «МЫ ІМ СТВОРЫМ ТАКІЯ Ж УМОВЫ, ЯК ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ»

Абмеркавалі і свежыя навіны. У пятніцу падчас перагавораў з Прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам была дасягнута дамоўленасць аб прыцягванні пакістанскіх спецыялістаў да працы ў Беларусі. Размова ішла пра 150 тысяч спецыялістаў. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што нашай краіне патрэбны найперш прафесіяналы, а не моладзь. І лепей, каб яны прыязджалі сем'ямі. Людзі, якія прыязджаюць з сям'ёй, лепш працуюць. «Дамовіліся, што мы ў гэтым кірунку будзем працаваць. Гэта значыць, мы цяпер выпрацуем падыходы адпаведныя. Я гавару: мы гатовы ў Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай абласцях прыняць вашу рабочую сілу. Але мы павінны бачыць кожнага», — адзначыў беларускі лідар. У прыватнасці, у пакістанскіх спецыялістах зацікаўлены на Баранавіцкім бавоўняным аб'яднанні. У Пакістане ўмеюць працаваць і з сыравінай, і з прадукцыяй з яе — і такі досвед вельмі патрэбны. «Мы ім створым такія ж умовы, як для беларусаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## «ТРЭБА ЖЫЦЬ ПА-ДОБРАМУ. ПОЛЬШЧА ДА ГЭТАГА НЕ ГАТОВА»

Журналісты пацікавіліся, чаго беларускі лідар чакае ад прэзідэнцкіх выбараў у суседняй Польшчы, ці можна чакаць змен у адносінах паміж нашымі краінамі. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што за электаральнай кампаніяй у Польшчы не сочыць. «Палякі загуляліся. Хто-хто, але палякі нашы ж людзі, славяне. Маглі б жыць нармальна, гандляваць, развівацца. Мы ж ніводнага паляка, калі яны санкцыі ўвялі, адсюль не выгналі. І многія тут працуюць. І няхай працуюць. Нармальна працуюць і лічаць беларусаў нармальнымі людзьмі. Але выбудавалі такую палітыку. Гэта кан'юнктуршчыкі. Яны бачаць, што недзе можна выхапіць лішні рубель — яны туды. Заўтра палітыка мяняецца — яны ў адваротны бок», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што гэта вельмі добра было відаць, калі польскія ўлады сварыліся з Еўрапейскім саюзам, каб дагадзіць ЗША. Але да ўлады прыйшоў Дональд Трамп, супраць якога ваявалі еўрапейскія лідары, і аддае ім доўг. Цяпер палякі прыціхлі трошкі, ужо не з амерыканцамі. Яны ўжо не ведаюць, куды падацца. «Яны пасварыліся з Еўрапейскім саюзам. Амерыканцы зараз за імі пільна назіраюць. Зразумела — плацдарм для таго, каб супраць нас, супраць Расіі і іншых краін. Польшча — гэта зручны плацдарм, але Трамп праводзіць сваю палітыку. Палякі прыціхлі. Дык навошта лаяліся з еўрапейцамі, якія вас утрымлівалі? Што зараз, куды зараз? Там зараз кожны за сябе. Таму ў іх такая палітыка — імгненная, сітуатыўная. Няма сур'ёзнай канцэпцыі. Гэта вельмі небяспечна, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Яны быццам бы з кітайцамі. Але калі з кітайцамі, тады з беларусамі трэба ў абдымку хадзіць. Кітайцы ж з вамі будуць гандляваць перш за ўсё (гэта іх інтарэс) праз Беларусь. Украіна закрыта, праз Стамбул — складаней, а Беларусь — калі ласка. Таму не трэба з намі сабачыцца. Трэба жыць па-добраму. Такая павінна быць палітыка. Польшча да гэтага не гатова».

Па словах беларускага лідара, прэзідэнт Польшчы — гэта «лялька, цацка, каб па калідоры ў Вашынгтоне хадзіць туды-сюды і чакаць, калі адчыняць дзверы, ты некалькі хвілін паглядзіш на прэзідэнта і паедзеш назад».

«Улада ў Польшчы — гэта прыніжэнне польскага народа, іх гонару і годнасці. Вось да чаго яны давялі палякаў, дзе людзі вельмі працавітыя, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Таму не назіраю, не цікаўлюся і не хвалююся. І вам раю асабліва не ўнікаць у гэтыя выбары, бо потым нас абвінавацяць, што мы ўмяшаліся ў гэтыя выбары».

У працяг тэмы Аляксандр Лукашэнка закрануў гісторыю са зніклай у Польшчы Анжалікай Мельнікавай. «Знайсці не могуць! Знайсці не могуць. Дык знайдзіце хоць», — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што беларускі бок у свой час хацеў выдаць Польшчы асуджанага Андрэя Пачобута, аднак польскі бок адмовіўся. «А Пачобут сказаў: «Я туды не паеду». У нас гэта ўсё запісана. І ўсе нас папракаюць, што мы ўціскаем кагосьці. Нікога мы не ўціскаем. Месца ўсім хапае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён прывёў яшчэ адзін прыклад: калі кіраўнік Саюза палякаў Беларусі Анжаліка Борыс выступіла за наладжванне дыялогу паміж Беларуссю і Польшчай, яе адразу ж пачыналі дзяўбсці.. «Вось іх палітыка — палітыка эскалацыі і абвастрэння», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. І па яго словах, нават новы Прэзідэнт (калі яго выберуць) нічога змяніць не зможа, ён не валодае для гэтага паўнамоцтвамі. «Але хацелася б, каб быў разважны нармальны чалавек. Не трэба прарасійскі, прабеларускі. Прапольскі няхай будзе. Які будзе працаваць у інтарэсах палякаў. Мы гэтага хочам. Калі жадаюць, будзем з імі працаваць», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

## ГЭТА НЕ КАТАСТРОФА

З пытанняў палітычных вярнуліся да пытанняў зямных. Журналісты пацікавіліся меркаваннем Прэзідэнта, як красавіцкія маразы паўплываюць на пасевы. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што трэба глядзець на Мінскую вобласць і Мінскі раён, дзе самыя складаныя глебы. Па іх варта меркаваць і пра іншыя тэрыторыі. Па словах кіраўніка дзяржавы, сітуацыя на палях паказвае, што пяць-шэсць градусаў марозу — гэта не катастрофа, тым больш што днём тэмпература была плюсавая. Аднак беларускі лідар прызнаў, што занепакоенасць выклікаюць рапс і азімы ячмень.

Журналісты пацікавіліся, ці будзе кіраўнік дзяржавы пераглядаць патрабаванні да аграрыяў, зыходзячы з такіх умоў. Аляксандр Лукашэнка на гэта заўважыў, што патрабаванні да аграрыяў звязаныя не столькі з сітуацыяй на палях, колькі з бязладдзем, якое яшчэ назіраецца ў сельскай гаспадарцы. Адна з найбольш балючых тэм — падзеж жывёл. «Выбачайце, як у вёсцы гавораць: калі ў цябе здохнуць цыляты і парасяты, то не будзе ні ялавічыны, ні свініны, не будзе і малака. Таму я пачаў гаварыць аб выканальніцкай дысцыпліне, дакумент адпаведны падпісаны. А зараз пачнецца ціск вельмі сур'ёзны на справе, на практыцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што выпрацоўка на аднаго чалавека ў Беларусі ў два ці тры разы ніжэйшая, чым у суседзяў. Таму і тэхналагічная, і выканальніцкая дысцыпліна павінна быць іншай. «Вось гэты крадзеж па дробязях на сельгаспрадпрыемствах... Гэта ўжо зашкальвае, гэта нясцерпна. Агіднае стаўленне да жывёл, у раслінаводстве да раслін, п'янкі. Дысцыпліны не хапае», — канстатаваў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што кожны павінен якасна выконваць работу на сваім працоўным месцы. І дадаў класічнае: «Лепш на зямлі працаваць, чым ваяваць».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

# ПАД ЗНАКАМ ГОДА ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ І ЮБІЛЕЮ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

## На суботніку працавалі і вышэйшыя службовыя асобы краіны

### КАЛЯ КУРГАНА СЛАВЫ ПРАЦАВАЛА КІРАЎНІЦТВА ЎРАДА І МІНАБЛВЫКАНКАМА

На мемарыяльным комплексе «Курган Славы» пад Мінскам работы па добраўпарадкаванні праводзілі прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын, віцэ-прэм'еры,



Апарат Савета Міністраў, а таксама кіраўніцтва цэнтральнага рэгіёна на чале са **старшынёй Мінскага аблвыканкама Аляксеем КУШНАРЭНКАМ.**

Аляксандр Турчын адзначыў, што мемарыяльны комплекс «Курган Славы» — гэта святое месца для ўсіх беларусаў, ды і не толькі беларусаў: «Бо гэты помнік ствараўся ў Савецкім Саюзе, і многія людзі з нашай былой вялікай краіны ўдзельнічалі ў яго ўзвядзенні. У мінулым годзе мы адзначалі 80-годдзе вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, а ў гэтым — 80 гадоў Вялікай Перамогі. Якраз мы завяршаем усе нашы работы на гэтым выдатным манументе. Засталося крыху да 9 Мая — завяршыць рэканструкцыю Кургана Славы, паставіць новую тэхніку. Суботнік — адзін са складнікаў надання Кургану Славы новага аблічча».

80-годдзе Вялікай Перамогі для кожнага жыхара краіны з'яўляецца святым, упэўнены кіраўнік урада. Аляксандр Турчын расказаў, што, праводзячы прэм'ер-міністра Пакістана Шахбаза Шарыфа ў аэрапорт, дэлегацыя ехала міма Кургана Славы: «Я яму расказваў пра тое, што перажыла наша краіна ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ды і не толькі ў тыя гады. Увесь час праз нашу краіну ішлі войны. Калі я расказваў, колькі гадоў была Беларусь пад акупацыяй, колькі загінула людзей, вядома, гэта вельмі ўразіла прэм'ер-міністра. І ён сказаў, што Беларусь вартая добрага жыцця».

Дзякуючы зладжанай рабоце брыгады Савета Міністраў і Мінскага аблвыканкама каля мемарыяла з'явіліся новыя зялёныя насаджэнні. Тут высадзілі дубы, клёны, вязы, бярозы, ясені, яблыні, таполі... Яны будуць нагадваць аб добрай традыцыі суботнікаў, працавітасці беларускага народа, стануць увасабленнем клопату пра прыгажосць роднага краю, што асабліва актуальна ў Год добраўпарадкавання.



### ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ ЗАКЛАЛІ ЭКСПАЗІЦЫЮ Ў БАТАНІЧНЫМ САДЗЕ

Да рэспубліканскага суботніка ў Мінску далучыліся і члены Савета Рэспублікі разам з сем'ямі. Работы ў сталічным Батанічным садзе было шмат: усе ўдзельнікі мерапрыемства раздзяліліся па розных зонах. Адны закладвалі экспазіцыю ў гонар 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, другія дапамагалі з добраўпарадкаваннем тэрыторыі і пасадкай дрэў, трэція займаліся пікіроўкай расады буякоў, а чацвёртыя — мульчыраваннем драўнянай дранкай ягадных кустоў.

— Для ўсіх нас гэта ўжо добрая традыцыя — праводзіць гэты дзень разам і рабіць нешта вельмі важнае і патрэбнае для нашай краіны. Аб'ядноўваючыся, наводзім парадак на нашых тэрыторыях, высаджваем дрэвы, робім вельмі важныя справы, — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

Па яе словах, тое, што такая традыцыя шмат гадоў захоўваецца ў нашай краіне — гэта абсалютна правільна.

— Разам мы можам зрабіць вельмі шмат. Мы прывыклі ганарыцца чысцінёй і парадкам у нашай краіне, гэта ўжо стала такім брэндам. Беларусь — чыстая, дагледжаная, прыгожая краіна, але за гэтым стаіць вялізная праца людзей, якія кожны дзень займаюцца гэтым. Падчас суботніка мы можам адчуць, лёгка гэта ці складана — захоўваць вось такой цудоўнай нашу краіну, — сказала яна.

Дзякуючы зладжанай працы членаў Савета Рэспублікі ў Батанічным садзе з'явіцца экспазіцыя з вельмі рэдкімі лістападнымі дрэвамі катальпа. Ужо праз 5 гадоў гэтыя пасадкі будуць цешыць усіх сваімі цудоўнымі кветкамі. Як запэўнівае кіраўніцтва Батанічнага сада, гэта будзе адна з найпрыгажэйшых алей у нашай краіне.



### ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПРАЦАВАЛІ НА ДОБРАЎПАРАДКАВАННІ МЕМАРЫЯЛЬНАГА КОМПЛЕКСУ «РАЗГРОМ»

Дэпутацкі корпус на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Ігарам Сергеенкам падчас Рэспубліканскага суботніка працаваў на мемарыяльным комплексе «Разгром», размешчаным у самай глыбінцы Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Там парламентарыі высадзілі 238 дрэў, прыбралі тэрыторыю ад лістоты, ачысцілі плітку ад травы і моху, аддалі даніну памяці вядомай партызанскай брыгадзе.

У дзень Рэспубліканскага суботніка групы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў працавалі адразу на некалькіх аб'ектах. Другая група дэпутатаў садзіла лес у Маладзечанскім раёне, трэцяя — ва Уздзенскім раёне.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергеенка адзначыў, што на месцы, дзе працавалі дэпутаты, у гады Вялікай Айчыннай вайны дыслацыраваліся амаль дзве тысячы партызан. Ён звярнуў увагу, што ў партызанскай брыгадзе «Разгром» ваявалі людзі розных нацыянальнасцяў: «Гэта і воіны-акружэнцы, якія фарміравалі гэтыя атрады, і мясцовыя жыхары, партыйныя кіраўнікі. Дарэчы, тут жа і дзейнічаў Мінскі міжраённы падпольны райкам партыі. У гады Вялікай Айчыннай вайны гэта было буйное злучэнне, якое размяшчалася ў цяжкадаступным месцы, сюды і нага фашыста нават не даходзіла. Складана ўявіць, якіх неймаверных намаганняў каштавала выйсці з балота пасля шматгадзіннага пераходу, выйсці на камунікацыі, сплanаваць і нанесці ўдар праціўніку, правесці канкрэтную аперацыю.

*(Пачатак. Працяг на стар. 6)*


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»** (Продавец)
на праве собственности

**Электронные торги состоятся 16.05.2025.**

**Лот № 1:** GAZ-2752, кузов (рама) № 275200D0526400 X96275200D0749627. 2013 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 6 360,00 руб.
**Задаток** – 636,00 руб.
**Лот № 2:** URAL 5557, кузов (рама) № XVN35714070202450 55570071332008. 2007 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 21 000,00 руб.
**Задаток** – 2 100,00 руб.
**Лот № 3:** GAZ-330232, кузов (рама) № 330230E0164473 X96330232E0821256. 2014 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 12 600,00 руб.
**Задаток** – 1 260,00 руб.
**Лот № 4:** GAZ-32213 244, кузов (рама) № 322100D0523788 X96322130D0747045. 2013 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 9 840,00 руб.
**Задаток** – 984,00 руб.
**Лот № 5:** GAZ-2752-298, кузов (рама) № 275200C0501995 X96275200C0725472. 2012 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 12 600,00 руб.
**Задаток** – 1 260,00 руб.
**Лот № 6:** GAZ-32213, кузов (рама) № 322100C0522738 X96322130D0746013. 2013 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 9 840,00 руб.
**Задаток** – 984,00 руб.
**Лот № 7:** UAZ 23632 241-02, кузов (рама) № XTT236320E0014102 236300E0587542. 2014 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 7 800,00 руб.
**Задаток** – 780,00 руб.
**Лот № 8:** VOLKSWAGEN CADDY, кузов (рама) № WV2ZZZ2KZ8X037094. 2007 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 8 400,00 руб.
**Задаток** – 840,00 руб.

**Местонахождение Лота № 1:**
Гомельская область, Гомельский район, Урицкий с/с, 1.
**Местонахождение Лота № 2:**
Брестская обл., г. Кобрин, ул. Дзержинского, 135.
**Местонахождение Лота № 3:**
Минская обл., г. Молодечно, ул. Л. Роменская, 165.
**Местонахождения Лотов № 4 – 8:**
г. Минск, ул. Скорины, 4.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Срок для подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатора электронных торгов).
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом ЭТП.
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 14.05.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 141/С-15192 (наименование: Жилой дом; назначение: Здание одноквартирного жилого дома), площадью 51,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, д. Чижевщина, ул. Центральная, 88, на земельном участке с кадастровым номером 122581505101000204 площадью 0,2390 га, составные части и принадлежности: сарай, сарай, колодец | 14 760,02 | 1 476,00 |

**Продавец:** ОАО «Рогознянский», 225111, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Ленинский, ул. Ленина, 14, тел. 80164165133.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.
**Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Условия продажи:** без условий.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. Шаг аукциона: 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 08 мая 2025 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 07 мая 2025 г. до 17.00**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-8038 (наименование: Квартира № 2; назначение: Квартира), площадью 35,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Парковая, 118-2 | 1 280,00 | 128,00 |
| **Лот № 2:** изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-8037 (наименование: Квартира № 1; назначение: Квартира), площадью 34,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Парковая, 118-1 | 1 280,00 | 128,00 |
| **Лот № 3:** изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-8039 (наименование: Квартира № 4; назначение: Квартира), площадью 34,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Парковая, 118-4 | 1 280,00 | 128,00 |
| **Лот № 4:** изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-8040 (наименование: Квартира № 5; назначение: Квартира), площадью 35,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Парковая, 118-5 | 1 280,00 | 128,00 |

**Продавец:** ОАО «Рогознянский», 225111, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Ленинский, ул. Ленина, 14, тел. 80164165133.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. Шаг аукциона: 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 08 мая 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 07 мая 2025 г. до 17.00**



Открытое акционерное общество
## «Дорстройиндустрия»
**16 мая 2025 года в 14.00** проводит открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | Автомобиль SKODA OCTAVIA, кузов (рама) TMBBD41Z872059619, инвентарный номер 50083, тип ТС – легковой хэтчбек, год выпуска – 2006, регистрационный знак 2788 ВВ-5, цвет – светло-серый | 10 000,00 | 1 000,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «Дорстройиндустрия», Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, тел. 801716 47531.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **16 мая 2025 года в 14.00** по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, 3 этаж, актовый зал.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности открытого акционерного общества «Дорстройиндустрия» (утверждённое приказом генерального директора от 31.12.2024 № 196).
4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «Дорстройиндустрия» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: BY32BAPB30123268800100000000 в ЦБУ № 510 Региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк», УНП 100211220.
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, кабинет 205; дата: **12.05.2025, время: 17.00.**
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, не позднее 5 рабочих дней.
8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

УНП 100211220


# ПАД ЗНАКАМ ГОДА ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ І ЮБІЛЕЮ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ




*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5)*

Таму такія памятныя месцы трэба ўтрымліваць ва ўзорным стане. У нас у краіне гэта якраз і робіцца. Трэба пастаянна даглядаць гэтыя месцы, прыводзіць сюды людзей, моладзь».

Паводле слоў Старшыні Палаты прадстаўнікоў, суботнікі заўсёды асацыююцца з вясной: «Яны заўсёды пачынаюцца ў красавіку, калі абуджаецца прырода, калі з'яўляюцца першыя парасткі зеляніны. І, вядома ж, хочацца прыбраць усё тое, што назапасілася ў зімовы перыяд — смецце, бруд і многае іншае. Хочацца таксама пасадзіць дрэва, якое дае жыццё ўсяму чалавецтву. Другі немалаважны складнік — суботнікі аб'ядноўваюць людзей, гуртуюць іх. На суботнікі выходзяць у розных населеных пунктах краіны: дзеці, моладзь і людзі больш сталага ўзросту. Гэта выдатная традыцыя. Іх, суботнікі, трэба праводзіць не толькі ў красавіку. У Год добраўпарадкавання трэба правесці як мінімум два Рэспубліканскія суботнікі, а то і больш», — падагульніў Ігар Сергяенка.

***

**Працавалі на суботніку і іншыя высокія службовыя асобы. Дзяржсакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** разам з калегамі і выхаванцамі Мінскага суvораўскага вучылішча добраўпарадкавалі Парк Перамогі ў пасёлку Наваколасава Стаўбцоўскага раёна, кіраўніцтва і работнікі Адміністрацыі Прэзідэнта працавалі на тэрыторыі брацкай магілы ў вёсцы Манькаўшчына Валожынскага раёна, работнікі ЦВК Беларусі на чале са **старшынёй Ігарам КАРПЕНКАМ** прыводзілі ў парадак самую высокую кропку Беларусі — гару Дзяржынскую ў Дзяржынскім раёне.

Да суботніка далучыліся ўсе рэгіёны, кожны раён, кожны населены пункт. **Кіраўнік Брэсцкай вобласці Пётр ПАРХОМЧЫК** разам з калегамі працаваў на тэрыторыі Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі, які размешчаны ў Брэсцкай крэпасці. Прадстаўнікі Магілёўскага аблвыканкама на чале са **старшынёй Анатолем ІСАЧАНКАМ** былі заняты на работах у Казіміраўскім лесе па вуліцы Раўчакова. Кіраўніцтва і супрацоўнікі Гродзенскага абласнога і гарадскога выканкамаў на чале з **губернатарам Юрыем КАРАЕВЫМ** разам са школьнікамі, работнікамі «Зелянбуда», «Ремстройавтодора» працавалі на тэрыторыі воінскага пахавання «Шталаг 324». **Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО,** яго намеснікі, **памочнік Прэзідэнта-інспектар па Гомельскай вобласці Руслан ПАРХАМОВІЧ, член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ** закладвалі фундамент дзіцячай паліклінікі ў Навабеліцкім раёне Гомеля. Віцебская вертыкаль на чале са **старшынёй аблвыканкама Аляксандрам СУБОЦІНЫМ** сфарміравала пляцоўкі пад будучыя газоны і высадзіла шаравідныя і пірамідальныя туі ў архітэктурных пілонах на плошчы Дзяржаўнага герба і сцяга ў Віцебску. У Мінску многія працавалі на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». Суботнік арганізавана прайшоў таксама і ў іншых раёнах сталіцы.

> **Пасля ўдзелу ў суботніку на пляцоўцы мемарыяльнага комплексу «Курган Славы» намеснік прэм'ер-міністра Анатоль СІВАК падвёў папярэднія вынікі. Паводле яго слоў, да суботніка далучыліся 2,4 млн чалавек, як і ў мінулым годзе.**
> **Сродкаў сабрана каля 16,5 млн рублёў, што на 2 млн рублёў больш, чым летась. Грашовыя сродкі, зароблены ў дзень правядзення суботніка, пойдуць на будаўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі.**







Паводле паведамленняў нашых карэспандэнтаў.

**Фота Лізаветы ГОЛАД, Віктара ІВАНЧЫКАВА, БелТА.**



# «ДЛЯ ТАГО КАБ ЖЫЦЬ НАРМАЛЬНА, ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ»

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала Наваполацк

**На сустрэчы з калектывам ААТ «Нафтазаводмантаж» Наталля Качанава абмеркавала пытанні развіцця рэгіёна ў цэлым і прадпрыемства ў прыватнасці.**

Генеральны дырэктар ААТ «Нафтазаводмантаж» Мікалай Яраміч на сустрэчы са Старшынёй Савета Рэспублікі расказаў аб бягучай фінансавай сітуацыі і перспектывах развіцця прадпрыемства. Наталля Качанава параразмаўляла з працоўным калектывам у адным з цэхаў, паведамляе БелТА.

«Задачы перад усімі стаяць няпростыя, у 2025 годзе заканчваецца пяцігодка, фарміруюцца новыя праграмы на новае пяцігоддзе», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер расказала, што заўсёды цікавіцца развіццём Полацка і Наваполацка, унікае ў многія пытанні. Яна праінфармавала, што, напрыклад, будаўніцтва другога моста ў Наваполацку не знята з парадку дня, ён прапрацоўваецца на высокім узроўні.

«Мы ўсе разумеем, што для таго, каб жыць нармальна, трэба працаваць. У Наваполацку гэта разумеюць як нідзе, таму што гэта горад-працаўнік», — сказала Наталля Качанава.

Работнікі ААТ «Нафтазаводмантаж» пацікавіліся ў спікера, як можна вырашыць пытанне з набыццём пуцёвак у аздараўленчыя лагеры для школьнікаў. Адзін з работнікаў прадпрыемства ўнёс прапанову для сферы ЖКГ — падчас капрамонту ў шматпавярховых дамах будаваць пандусы, каб па іх маглі бяспечна спускацца пенсіянеры, маці з каляскамі. Таксама калектыў абмеркаваў са спікерам тэмы медыцынскіх паслуг і медстрахоўкі, добраўпарадкавання набярэжнай у горадзе. Усе пытанні Наталля Качанава ўзяла на асабісты кантроль.

Таксама Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з ветэранам Анатолем Катырлам. Анатоль Фёдаравіч — жыхар блакаднага Ленінграда, пенсіянер органаў унутраных спраў. Нягледзячы на паважаны ўзрост, ён займае актыўную грамадзянскую пазіцыю, цікавіцца жыццём краіны, з'яўляецца ганаровым старшынёй ветэранскага аб'яднання горада.

Наталля Качанава расказала, што для яе было гонарам сустрэцца з наваполачанінам і гэта сустрэча дала старт новай акцыі.

«Сёння мы далі старт акцыі «Савет Рэспублікі з удзячнасцю ветэранам». Мы, усе члены Савета Рэспублікі, будзем сустракацца з ветэранамі, яны будуць дзяліцца ўспамінамі. Гэта робіцца для таго, каб тая гісторыя, якая ёсць у іх памяці, жыла ў нашых сэрцах», — адзначыла спікер.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што з кожным годам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны становіцца ўсё менш і кожны з іх заўсёды акружаны клопатам дзяржавы. Сустрэчы з імі ніколі не забываюцца. Наталля Качанава падзялілася, што яшчэ школьніцай віншавала з Днём Перамогі Героя Савецкага Саюза Зінаіду Тусналобаву-Марчанка, і гэтыя ўспаміны ніколі не згаснуць у яе душы.





Спікер адзначыла, што «Нафтазаводмантаж» з'яўляецца адным са значных прадпрыемстваў Наваполацка і павышэнне эфектыўнасці яго дзейнасці — важная задача.

Наталля Качанава падкрэсліла, што ў нашай краіне ёсць вялікі пакет сацгарантый — дапамогі, у тым ліку для шматдзетных сем'яў, даступная ахова здароўя і адукацыя. Яна нагадала, што сёлета Прэзідэнт падпісаў указ, паводле якога мясцовым уладам, кіраўнікам прадпрыемстваў можна браць крэдыты на ўзвядзенне арэнднага жылля і затым размяркоўваць яго па неабходнасці, у тым ліку сярод маладых спецыялістаў для замацавання іх на месцах.

# БОЛЬШ ЗАРАБЛЯЕМ — БОЛЬШ ЗБЕРАГАЕМ

## Як уплывае павелічэнне даходаў на зберагальную актыўнасць беларусаў і як рост попыту адбіваецца на інфляцыі?

**Днямі Белстат паведаміў: індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў сакавіку бягучага года ў параўнанні з лютым бягучага года склаў 100,8 %, са снежнем 2024-га — 102,8 %.**



Так, базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя да ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у сакавіку 2025 года ў параўнанні з лютым 2025-га склаў 100,9%, са снежнем 2024-га — 102,2%.

Як адзначаюць аналітыкі Еўразійскага банка развіцця ў сваім штотыднёвым макраагляздзе, паскарэнне росту цэн адбываецца за кошт падаражання харчовых тавараў на 7,5 % у сакавіку (у гадавым выражэнні) пасля 6,7 % месяцам раней, што звязана як з павышэннем цэн на сезонныя тавары, так і паслабленнем беларускага рубля да расійскага (бо асноўны імпарт прадуктаў харчавання, звяртаюць увагу аналітыкі, ідзе з Расійскай Федэрацыі) у апошнія месяцы.

Інфляцыя на паслугі ў сакавіку склала 6,6 % у гадавым выражэнні, што прыкладна адпавядае ўзроўню папярэдняга месяца.

— Пры гэтым рост коштаў на нехарчовыя тавары запаволіўся да 3,2 % у сакавіку (год да года) пасля 3,4 % у лютым, — акцэнтуюць увагу спецыялісты ЕАБР.

Паводле іх ацэнак, інфляцыя будзе некалькі перавышаць мэтавы арыенцір на фоне росту ўнутранага попыту, падтрыманага павелічэннем заробкаў і пашырэннем крэдытавання.

Дарэчы, аб крэдытаванні. Аналітыкі ЕАБР таксама звяртаюць увагу на рост крэдытнай актыўнасці ў нашай краіне.

— Крэдытны партфель банкаў у нацыянальнай валюце вырас на 1,2 % у лютым 2025 года ў месячным выражэнні пасля 2 % у студзені, — адзначаецца ў макраагляздзе, і тлумачыцца за кошт чаго. — Пашырэнне адбываецца як за кошт павелічэння крэдытаў прадпрыемствам, так і насельніцтву.

У прыватнасці, крэдытны партфель юрыдычных асоб вырас на 0,8% у лютым у месячным выражэнні пасля 2,6% у студзені. Больш за 70% прыросту прыпала на дзяржаўныя прадпрыемствы, аб'ём крэдытавання якіх вырас на 1,1% месяц да месяца. Партфель рознічнага крэдытавання вырас на 1,3% у лютым 2025-га пасля 1% месяцам раней, яго павелічэнне было прыкладна пароўну забяспечана павелічэннем іпатэчнага (+1,1%) і спажывецкага (+1,8%) крэдытавання.

У Еўразійскім Банку развіцця тлумачаць: рост крэдытавання фізічных асоб падтрымліваецца ростам даходаў насельніцтва.


**ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ**

**Открытое акционерное общество**
**«Стройтрест № 1»**

*220034, г. Минск, ул. Платонова, 15, УНП 100288960*

Доля государства в уставном фонде эмитента 91,5589 (всего в %).
**Количество акционеров – всего 882 лица.**

**Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошл. года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 1146,43 | 627,11 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 1146,43 | 627,11 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 1,000503 | 0,547283 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 1,000503 | 0,547283 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | год | 2023 год | x |
| Дата принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 27.03.2024 г. | x |
| Срок выплаты дивидендов | число, месяц, год | до 22.04.2024 | x |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 32,59 | 27,76 |
| Кол-во простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

**Отдельные финансовые результаты открытого акционерного общества:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошл. года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | тысяч рублей | 452956 | 305085 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 437891 | 295917 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | 9030 | 7417 |
| В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 15065 | 9168 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельнсоти | тысяч рублей | -6448 | -1719 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | 413 | -32 |
| налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 2505 | 1893 |
| Чистая прибыль(убыток) | тысяч рублей | 6525 | 5524 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 25859 | 20560 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 2121 | 3785 |

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 27.03.2025.

Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности подготовлено 06 марта 2025 года.

Общество с ограниченной ответственностью «Мир аудита», 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 6Б, помещение 4Н, кабинет 17, зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета 27.07.2021 г., свидетельство о государственной регистрации № 0185169, выдано 27.07.2021 г., УНП 193576020.

**Период, за который проводился аудит:** с 01 января по 31 декабря 2024 года.

**Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях:**

Прилагаемая бухгалтерская отчетность достоверно, во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Открытого акционерного общества «Стройтрест № 1» по состоянию на 31 декабря 2024 г., финансовые результаты ее деятельности и изменение ее финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения:

Свод корпоративных правил одобрен Обществом и применяется в необходимой мере.

Адрес официального сайта ОАО в глобальной компьютерной сети Интернет: trest1.by



Извещение о проведении повторных публичных торгов в форме электронного аукциона

**Организатор аукциона, оператор ЭТП:**
ООО «Индустрия Инноваций»,
г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

**Продавец:** ЗАО «Мальва-проспект»,
223028, Минская обл., Минский р-н, с/с Ждановичский,
аг. Ждановичи, ул. Линейная, д. 3, каб. 303

| № | Наименование | Начальная цена, без НДС |
|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение (магазин «Цветы»),** расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 90, общ. пл. 192,5 кв. м | 288 550,00 долл. США в эквиваленте по курсу НБ РБ на день проведения торгов |

**Аукцион состоится 25.04.2025,** начало 10.00, окончание 16.00 на электронной торговой площадке iintorgi.by

Время приема заявок: с 15.04.2025 09.00 до 24.04.2025 г. 17.00.

Иные сведения о порядке проведения, в том числе об оформлении участия в торгах, определении лица, выигравшего торги, опубликованы на сайте ЭТП и в ранее опубликованном извещении о проведении публичных торгов в форме электронного аукциона в газете «Звязда» № 12 (30400) от 21.01.2025 стр. 12

**Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95;**
**e-mail: e.pinchuk@iin.by**

**Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»**
www.bsb.by

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
за 31 марта 2025 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31 марта 2025 г. | 1 января 2025 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 305 434 | 451 734 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 7 661 | 7 042 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 257 841 | 226 370 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 316 490 | 296 531 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 115 251 | 121 750 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 84 951 | 112 070 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 35 | 35 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 66 409 | 65 443 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | 69 | 69 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 28 264 | 36 435 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 1 182 405 | 1 317 479 |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 40 | 40 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 336 | 15 267 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 958 709 | 1 095 048 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 9 804 | 11 086 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 968 889 | 1 121 441 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 22 900 | 22 900 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 23 295 | 17 276 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 45 198 | 45 711 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 122 123 | 110 151 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 213 516 | 196 038 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 182 405 | 1 317 479 |

Форма 2

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за 31 марта 2025 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 31 марта 2025 г. | 31 марта 2024 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 8 627 | 5 844 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 665 | 499 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 7 962 | 5 345 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 18 320 | 18 859 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 9 960 | 8 367 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 8 360 | 10 492 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 397 | 438 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 186 | (243) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 26 553 | 15 841 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - | 9 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 2 375 | 1 820 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 117 | 390 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 16 406 | 13 521 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 1 030 | 2 633 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 23 764 | 14 298 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 5 773 | 3 327 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 17 991 | 10 971 |

Председатель Правления Дубков С.В.

Главный бухгалтер Бельник А.Н.

Дата подписания: 4 апреля 2025 г.

УНП 807000069

# «У ГЭТЫЯ ПРАЦЭСЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ УКЛЮЧАНЫ ЎСЕ»

## Ідэолагі — аб сутнасці Дырэктывы № 12

Падпісаная кіраўніком дзяржавы Дырэктыва №12 «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы» вельмі канкрэтна і даступна дае зразумець усім без выключэння, што ідэалогія — гэта не нейкае абстрактнае паняцце, а важны складнік існавання дзяржавы, краіны, яе суверэнітэту і, адпаведна, дабрабыту кожнага асобна ўзятага грамадзяніна. Адпаведна ўсіх без выключэння грамадзян яна і датычыцца.

Пакуль некаторыя грамадзяне асэнсоўваюць гэты пасыл, ёсць спецыялісты, для якіх дырэктыва з першага дня яе апублікавання стала настольным дакументам, кіраўніцтвам да дзеяння і дапаможнікам у рабоце. Гэта людзі, якія займаюцца ідэалагічнай работай на месцах. Менавіта ў іх мы і пацікавіліся, якім яны бачаць значэнне і сутнасць падпісанага Прэзідэнтам праграмнага дакумента.

Як звяртае ўвагу **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА**, вызначыўшы сам змест ідэалогіі беларускай дзяржавы, дырэктыва ўстанаўлівае вельмі шырокі спектр задач яе рэалізацыі. «Безумоўна, адзінае разуменне грамадствам таго, што ўяўляе сабой мадэль развіцця нашай дзяржавы, ролі ў ёй грамадзяніна, узаемасувязі грамадства і дзяржавы, не будзе поўным, калі мы гэту работу будзем праводзіць толькі ў асобных групах: школах, дзяржаўных арганізацыях, — лічыць галоўны ідэолаг сталіцы. — У гэтыя працэсы павінны быць уключаны ўсе».

Вольга Чамаданава адзначае, што работа ў гэтым кірунку з арганізацыямі прыватнай формы ўласнасці ў горадзе Мінску праводзіцца ўжо як некалькі гадоў. «У шэрагу камерцыйных арганізацый функцыі па арганізацыі ідэалагічнай работы ўскладзены на аднаго з намеснікаў кіраўніка або службовую асобу», — канкрэтызуе яна.

«Дырэктыва № 12 — гэта свайго роду рэакцыя на тое, з чым мы сутыкнуліся ў апошнія гады, — адзначае Вольга Чамаданава. — У выніку выпрацаваны новыя формы работы, кірункі, якія ляглі ў яе аснову. Усё, што там канцэптуальна выкладзена, — гэта па вялікім рахунку тое, з чым мы сёння і працуем. Але дырэктыва сістэматызавала, упарадкавала многія кірункі, надала фон актуальнасці для ўсіх рэгіёнаў без выключэння, каб не было разнастайнасці, кшталту «хто як разумее, той так і рухаецца».

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА** адзначае: гэту дырэктыву чакала ўся ідэалагічная вертыкаль Беларусі. «Дакумент дапаможа ўдасканальваць нашу работу, прычым ва ўсіх працоўных калектывах, незалежна ад формы ўласнасці, — гаворыць яна. — Ідэалагічная работа ахоплівае ўсё насельніцтва Беларусі цалкам, і гэта вельмі важна. Яна накіравана на падтрымку ўнутранай і знешняй палітыкі краіны, умацаванне спрыяльнага маральна-псіхалагічнага клімату, фарміраванне ў членаў працоўнага калектыву светапогляду, заснаванага на пачуцці патрыятызму, грамадзянскай сталасці, усведамлення прыналежнасці да беларускага народа. Кожны беларус павінен разумець, што ён грамадзін сваёй краіны і адчуваць сябе патрыётам».

Як практык Кацярына Музычэнка з задавальннем адзначае, што цяпер ідэалагічная работа становіцца больш сістэматызаванай і дакладнай. На думку суразмоўніцы, дырэктыву можна назваць своеасаблівым папераджальным дакументам. «Рэалізацыя яе палажэнняў дазволіць падрыхтаваць грамадства да магчымых выклікаў. Дзякуючы гэтай дырэктыве актуалізуюцца ўсе нарматыўна-прававыя акты, якія датычыліся ідэалагічнай работы, — гаворыць Кацярына Музычэнка. — Гэта ўказ Прэзідэнта праграмнага характару. На аснове яе будзе распрацоўвацца яшчэ шэраг праграмных дакументаў, па якіх мы будзем працаваць».

Прыняцце Дырэктывы № 12 — гэта знакавая падзея, якая вызначае вектар развіцця нашай краіны ва ўмовах сучасных глабальных выклікаў, упэўнена **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Смалявіцкага райвыканкама Мінскай вобласці Вераніка СНІЦАРЭНКА.**

Яна дадала, што дырэктыва выразна тлумачыць сутнасць, асновы і прынцыпы ідэалогіі беларускай дзяржавы, раскрывае механізмы функцыянавання ідэалагічнай вертыкалі і напрамкі ідэалагічнай работы.

«Для мяне як ідэолага новым стала вызначэнне канкрэтнага кола суб'ектаў, на якіх ускладаецца рэалізацыя дзяржаўнай ідэалогіі. Прапісаная і «персанальная адказнасць» кіраўнікоў розных узроўняў за «стан ідэалагічнай работы». Для нашага аддзела гэта безумоўны вектар дапамогі і садзейнічання, галоўным у якім застаецца інфармацыйны складнік, у тым ліку камунікацыя паміж жыхарамі раёна на ўсіх узроўнях», — падагульніла Вераніка Сніцарэнка

**Начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Міёрскага райвыканкама Віцебскай вобласці Аксана АШУРКА** адзначае: «Сіла гэтага дакумента ў тым, што там адлюстраваны і гістарычныя вехі фарміравання ідэалогіі нашай краіны, і ўсе аспекты сучаснай сітуацыі. У нас і сёння выбудаваная моцная ідэалагічная вертыкаль, але яна будзе яшчэ мацнейшай, калі да яе далучацца суб'екты гаспадарання ўсіх формаў уласнасці. На Міёршчыне некалькі даволі буйных для нашага рэгіёна прамысловых прадпрыемстваў — мясакамбінат, лясгас, ТАА «Металапракатная кампанія». Працуюць больш за дзесяць сельгасарганізацый, сялянскія фермерскія гаспадаркі, суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва — гэта значыць эканоміка раёна прадстаўлена прадпрыемствамі розных формаў уласнасці. З прыняццем дакумента арганізацыі павінны будуць будаваць сваю дзейнасць на аснове сацыяльнай адказнасці, яны павінны будуць удзельнічаць у вырашэнні агульных для раёна пытанняў, уключаць сваіх работнікаў у прафсаюзы, іншыя грамадскія арганізацыі. Мы павінны быць разам і дзейнічаць сумесна — у краіне, дзе няма ўнутраных рознагалоссяў, ёсць месца толькі стабільнасці і эканамічнаму развіццю».

Як адзначае Аксана Ашурка, для ідэолагаў дырэктыва акрэсліла тыя напрамкі, на якіх неабходна сканцэнтраваць сілы і рэсурсы для выканання не толькі ключавых ідэалагічных задач, але і для таго, каб абараніць краіну ад знешніх выклікаў, умацаваць і далей развіваць унікальную мадэль нашай Беларусі, аснову якой складае чалавек.

**Намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама Гродзенскай вобласці Марына ДАВЫДЗІК** падкрэслівае, што, згодна з Канстытуцыяй, дэмакратыя ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове ідэалогіі беларускай дзяржавы. «Наша ідэалогія адлюстроўвае нацыянальныя гістарычныя традыцыі і каштоўнасці народа, аб'ядноўвае ў імкненні да захавання суверэнітэту і развіцця беларусаў як гістарычнай супольнасці, — звяртае ўвагу яна. — Як дзяржаўны служачы, які займаецца непасрэдна ідэалагічнай работай, я атрымала фундаментальны дакумент, які рэгулюе гэтую работу, у якім уніфікуецца падыход да арганізацыі гэтай работы ва ўсіх галінах і сферах дзейнасці нашага грамадства».

Па словах прадстаўніка мясцовай вертыкалі ўлады, для кожнага ідэалагічнага супрацоўніка дырэктыва стане не проста кіраўніцтвам да дзеяння, а і штодзённым планам работы, у якім шчыльна пераплятаюцца эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя кампаненты. «Дырэктыва ўстанаўлівае такую сістэму работы з грамадзянінам, якая пакажа гэтаму грамадзяніну ўласную значнасць у краіне, — падкрэслівае яна. — Ад гэтага многае залежыць. Калі я разумею, чаму я патрэбен сваёй краіне, значыць любое маё дзеянне і работа будуць эфектыўнымі. Калі мы не абаронім сваю ідэалогію, не аб'яднаемся вакол агульнай ідэі, то можам страціць сябе — беларусаў. Таму вельмі своечасовы, важны і фундаментальны дакумент».



# ЖЫВЫ ВОДГУК НА МУЖНАСЦЬ І ПАКУТЫ

Канцэрт-рэквіем «Кожны трэці», які па распараджэнні Прэзідэнта паказалі на мінулым тыдні жыхарам усіх рэгіёнаў краіны, нікога не пакінуў раўнадушным. Сведчаннем таму той факт, што ўчора ўвечары ў Палацы Рэспублікі прайшоў яшчэ адзін канцэрт, незапланаваны, арганізаваны дадаткова па просьбе людзей, якія хацелі на ім пабываць. А ў пятніцу і суботу канцэрт-рэквіем убачылі жыхары Міншчыны і Гомельшчыны.

## «КОЖНАЕ СЛОВА ПРАПУСКАЕМ ПРАЗ СЭРЦА»

На канцэрце для прадстаўнікоў сталічнага рэгіёна прысутнічаў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей КУШНАРЭНКА.** Ён расказаў журналістам і сваю асабістую гісторыю Перамогі: «У маёй сям'і, як і ў мільёнах іншых, ёсць такія гісторыі. Маю прабабулю і бабулю сагналі ў Германію. Мой дзед — франтавік, пра што я з гонарам гавару, дэсантнік, сувязіст. Прайшоў вайну, у 1945 годзе вызваляў Аўстрыю. Меў баявыя ўзнагароды — ордэн Чырвонай Зоркі, «За вызваленне Будапешта», «За ўзяцце Венгрыі». Жудасная вайна закранула практычна кожную сям'ю ў нашай краіне і мы павінны памятаць гэта і дзякаваць нашым дзядам, прадзедам, удзельнікам тылу за тое, што сёння жывём у цудоўнай, свабоднай краіне».

Канцэрт-рэквіем «Кожны трэці» сёння, паводле яго слоў, — гэта жывы водгук на мужнасць мільёнаў людзей: «Як знакі святасці гэтай памяці на Міншчыне знаходзяцца не толькі ўсім добра знаёмыя Хатынь і Курган Славы, але і амаль дзве тысячы помнікаў у гарадах і малых населеных пунктах. Праз 80 гадоў мы кожны год адкрываем новыя трагічныя старонкі гісторыі вайны, — нагадаў Аляксей Кушнарэнка. — Дзякуючы гістарычным дакументам і ўспамінам відавочцаў, сведак тых жудасных падзей сёння мы цэнім свабоду, незалежнасць і правы вырашаць самім свой лёс. Мы павінны быць годнымі нашчадкамі, працаваць з максімальнай самааддачай, каб наша родная Беларусь развівалася і квітнела».

«...У лагерах смерці нацысты пазбавілі жыцця звыш 1,4 мільёна савецкіх грамадзян. Дзейнічала 14 канцэнтрацыйных лагераў для дзяцей, у тым ліку донарскі дзіцячы канцлагер — «Чырвоны Бераг». Толькі праз яго прайшло 12 тысяч дзяцей, у пяці тысяч з іх кроў забралі цалкам», — такія словы прагучалі ў зале перад песняй «Голас маці», якую кранальна выканалі прадстаўнікі творчай майстэрні эстраднага мастацтва «Хвілінка».

**Актрыса тэатра і кіно, спявачка Аляксандра ГАЙДУК** лічыць вельмі важным, што канцэрт аб'ядноўвае розныя пакаленні артыстаў: «Як сёння расказаць нашым дзецям, падлеткам пра тыя страшныя часы? Як данесці, што такое фашызм, нацызм? Але стаіць на сцэне дзіцячы калектыў «Хвілінка» і шчыра плача. Яны на сваёй мове аднагодкам данясуць праўду пра вайну так, як не змогуць дарослыя».

«Самае складанае ў гэтым праекце — выхад на сцэну, які суправаджаецца комам у горле, — са слязамі на вачах падзялілася меркаваннем **салістка Вялікага тэатра Беларусі Дар'я ГАРАЖАНКА.** — Сыходзіш са сцэны са слязамі на вачах. Упэўнена, у кожнага артыста ёсць сямейная гісторыя пра вайну. У маім выпадку гэта апавяданні бабулі пра чатырох яе братоў, якія сышлі на фронт. Вярнуўся з іх толькі адзін. З тых часоў іх маці не магла ні адну ноч спаць спакойна, прачыналася ад кожнага шоргату і груку. Да апошніх дзён жыцця яна спадзявалася, што сыны, якія зніклі без вестак, жывыя і аднойчы вернуцца. Яна заўсёды нагадвала маёй маме, каб тая абавязкова кінула 9 мая ў Дняпро гваздзікі...»

Што датычыцца выставак, іх у фае Палаца Рэспублікі прадстаўлена чатыры: «Лёсы, складзеныя ў трохкутнік», «Подзвігі і лёсы партызан у дакументах», «Генацыд: дакументы і відавочцы сведчаць», «Хлеб — нябачная сіла Перамог». Усе яны наглядна ілюструюць, якімі жудаснымі былі тыя 1940-я. Наведвальнікаў, якія вывучалі экспанаты і архіўныя дакументы, як заўсёды, сабралася шмат.

Адна з іх — пенсіянерка Таццяна. Жанчына расказала, што ішла на мерапрыемства аднячасова з пякучым болем у сэрцы і гонарам за сваіх суайчыннікаў, якія цаною сваіх жыццяў здабылі Вялікую Перамогу: «Бачыць фатаграфіі і чытаць лісты людзей, якія перажылі гэтыя жудасныя гады, мне вельмі складана. Архівы прымушаюць задумацца нас пра тое, якой цаной была дасягнута гэта Перамога».

## «МЫ ПОМНІМ, МЫ ВЕДАЕМ І МОЖАМ ГАВАРЫЦЬ ПРА ГЭТА АДКРЫТА»

У суботу ў Палац Рэспублікі прыехалі гамяльчане, паведамляе БелТА. Кожны з тых, хто трапіў на ўнікальную праграму, дзе вогненныя гісторыі вайны і яе герояў гучаць сэрцамі дзясяткаў артыстаў, чарговы раз успомніў замучаных дзяцей страшнага лагера смерці «Чырвоны Бераг», дарослых і маленькіх вязняў «Азарычаў», а таксама тых, хто ў апошнія імгненні свайго жыцця стаяў на краі расстрэльнай ямы, чые імёны, магчыма, да гэтага часу застаюцца невядомымі. Кампазіцыя «Дрэва жыцця», якая з'явілася на Гомельшчыне, — чарговае сведчанне таго, што людская памяць жыве.

Адкрываючы праграму для сваіх землякоў, **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО** адзначыў: «На абарону краіны сталі ўсе — кожная вёска, дом, сям'я. Імёны загінулых беларусаў у гады вайны сабраны ў адзіную кнігу «Памяць», якая налічвае 158 тамоў, 38 з якіх прысвечаны Гомельскай вобласці. Генпракуратура працягвае расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мы праводзілі пошукавыя работы практычна ў кожным раёне вобласці. Адно з масавых пахаванняў было знойдзена ў Гомельскім раёне, у Чонкаўскім лесе. Там немцы забілі больш за 4,5 тысячы чалавек», — адзначыў ён.





Фота БелТА.

Складана быць гледачом такой праграмы, якая расказвае аб гібелі мільёнаў людзей, на чыю зямлю прыйшлі са страшнай мэтай — знішчыць 75 працэнтаў насельніцтва, але яшчэ больш складана даносіць няпростую, напоўненую болем і смерцю гісторыю.

Гамяльчанка Алена Памазкова адзначыла, што ёй вельмі складана падабраць словы, настолькі моцнымі аказаліся эмоцыі.

«Нумары пранізваюць, уражваюць, выверана б'юць у цэль. Яны не могуць не ўражваць, паколькі тое, што адбываецца на сцэне, адгукаецца ў кожнай клетцы цела. А колькі разоў зала паднімалася ў адзіным парыве! І гэта непаўторныя эмоцыі. Мае бабуля і дзядуля былі ўдзельнікамі вайны, дзякуй Богу, вярнуліся дадому. Аднак вайна засталася ў іх сэрцы незагойнай ранай...»

**Яна ВАЛАСАЧ.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 05.05.2025.**

**Лот № 1**
Сооружение (инв. №: 500/С-1005851),
площадь – 1718 кв. м.
Адрес: г. Минск, пр-т Победителей, д. 49.
Земельный участок № 500000000007009184, 0,1718 га.
Право временного пользования земельным участком
с 23.03.2021 по 31.01.2031.
Начальная цена с НДС 20 % – 35 105,00 доллара США.
Задаток – 10 985,41 руб.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 30.04.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «МИНСККОНТРАКТ»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 19.05.2025.**

**Лот № 1:** ФОЛЬКСВАГЕН ТРАНСПОРТЕР,
кузов, рама № WV2ZZZ70Z3X017379, 2002 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 19 560,00 руб. Задаток – 1 956,00 руб.

**Лот № 2:** ГАЗ 3309,
кузов, рама № 33070080151785 X9633090080961477, 2008 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 10 800,00 руб. Задаток – 1 080,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–2:**
Минский р-н, пос. Сухорукие, ул. Базовская, 1А.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 15.05.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных
торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 05.05.2025.**

**Лот № 1:** Торгово-сервисный центр
с инв. № 200/С-77262, 1745,4 кв. м.
Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Короткевича, 24.
Земельный участок № 240100000003004520, 0,2476 га.
Право аренды.

**Лот № 2:** Помещение магазина
с инв. № 610/D-52517, 1200,4 кв. м.
Находится в кап. строении, № 610/С-1810, расположенном
на земельном участке № 640400000001000421 (0,7718 га).
Адрес: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов,
ул. Лопатина, 162-65.
Обременения по Лотам №№ 1–2:
Аренда, ипотека, залог права аренды земельного участка.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

**Начальная цена с НДС 20 %:**
**Лот № 1** – 1 826 116,57 доллара США. Задаток – 571 446,66 руб.
**Лот № 2** – 773 639,00 доллара США. Задаток – 242 094,85 руб.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 30.04.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ООО «ПКФ» Сельмашсервис», г. Могилев, ул. Сурганова, д. 13Б, оф. 2, УНП 700366891 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов**
Местоположение: Могилевская обл., г. Горки, ул. Мира, 61

**Трактор ДТ-75**
**с бульдозерным оборудованием**
**(после кап. ремонта 2025, двигатель А-41, 2008 г. в.).**

**Начальная цена без НДС – 35 000,00 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **5 (пять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи |

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 6 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 19.05.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белинвестбанк»** (Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 30 апреля 2025 г.**

**Лот № 1**
Капитальное строение с инв. № 700/С-52650, площадь 459,8 кв. м
(имеются изменения капитального строения, подлежащие государственной регистрации).
Начальная цена с НДС 20 % – 396 080,48 бел. руб.
Задаток – 19 804, 02 бел. руб.
Капитальное строение с инв. № 700/С-52650 расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000005000531 (право постоянного пользования, 0,5079 га). Доля: 618/10000.
Обременения: аренда.
**Адрес:** Республика Беларусь, Могилевская обл., г. Могилев, ул. Симонова, 169А.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 25.04.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182


В **суд Лидского района Гродненской области** поступило заявление об объявлении умершей Силко Светланы Алексеевны, 19 апреля 1962 г. р., уроженки з/с Ленинского Комсомола Целиноградской области Республики Казахстан, жительницы г. Лиды, ул. Гастелло, д. 47, корп. 3, кв. 136.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, которым что-либо известно о СИЛКО С.А., сообщить в суд Лидского района в течение двух месяцев с момента опубликования объявления по тел.: 80154646608, 80154646615.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
Камуністычная партыя (бальшэвікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР
69 (7395) НЯДЗЕЛЯ 15 красавіка 1945 г. Цана 20 кап.

# ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ



## • На фронце

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, на працягу 14 красавіка на Земландскім паўвостраве, на паўночным захадзе і захадзе ад Кёнігсберга, войскі 3-га Беларускага фронту з баямі занялі больш за 60 населеных пунктаў, сярод якіх Алькнікен, Рантау, Нойкурэн, Лопенен, Засау, Батау, Тыкрэнен, Санкт Лорэнц, Мосікен, Котцлякен, Ауерхоф, Койенен, Поерштытэн, Косненен, Зеерапен, Шоршэнен, Бэрвальдэ, Доротэнхоф, Грос Хайдэкруг і чыгуначныя станцыі Нойкурэн, Зеерапен. У баях за 14 красавіка ў гэтым раёне войскі фронту ўзялі ў палон больш за 7 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

На тэрыторыі Чэхаславакіі, на ўсходзе і паўднёвым захадзе ад горада Гадонін, войскі 2-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, занялі населеныя пункты Мазур, Кужэлоў, Малая Врбка, Кнеждуб, Стражніцэ, Лужыцэ, Мікульчыцэ, Моравска Новая Весь, Грушкі, Новы Жыжкоў, Стары Бржэслаў. «**На поўначы і паўночным усходзе ад Вены войскі фронту з баямі занялі на тэрыторыі Аўстрыі населеныя пункты Хохенаў, Грос Інцэрслорф, Обер Зульц, Бад-Піраварт, Кронберг, Рыдэнталь, Ульрыхскірхен, Прэзінг, Путцынг Энцэральд», — паведамляла «Звязда».**

На захадзе ад Вены войскі 3-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, фарсіравалі раку Трайзен і занялі горад Герцогенбург, а таксама больш за 60 іншых населеных пунктаў, у тым ліку буйныя Міхельхаузен, Пішэльсдорф, Цвентэндорф, Понзее, Трасдорф, Зітцэнберг, Гетцэрсдорф, Інцэрдорф, Крэйц, Осарн, Капельн, Ейтэндорф, Мурцтэтэн, Бохаймкірхен, Хрыстофен і чыгуначныя станцыі Міхельхаузен, Грасдорф, Гемейнлебарн. У баях за 13 красавіка франтавікі ўзялі ў палон больш за 2 200 салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі наступныя трафеі: танкаў і самаходных гармат — 107, бронетранспарцёраў — 19, палявых гармат — 135, мінамётаў — 44, кулямётаў — 294, аўтамашын — 615, паравозаў — 69, чыгуначных вагонаў — 2 367, складоў з ваеннай маёмасцю — 37.

## • У тыле

У калгасах Хойніцкага раёна налічвалася 362 гектары садоў. Апрача таго, каля 100 гектараў былі на прысядзібных участках калгаснікаў і 50 гектараў у саўгасах. З надыходам вясны ў іх пачалася дружная праца: «**Створаныя ў калгасах садова-гародныя брыгады яшчэ ранняй вясной пачалі абрэзку дрэў. Плошча вакол дрэў ускапвалася рыдлёўкамі. На яблынях і грушах зрэзана сухое галлё і прарэджаны кроны. Збіраецца і знішчаецца злейшы шкоднік сада — вусень. Кара пладовых дрэваў ачышчаецца ад моху і лішайніка. Паміж радамі дрэў у глебу кладуцца ўгнаенні», — паведамляла наша газета ў гэты дзень.**


СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ 1945 ГОДА
КАЛГАСЫ ХОЙНІЦКАГА РАЁНА ЗАСЯВАЮЦЬ ДАВАЕННУЮ ПЛОШЧУ
У БАРАЦЬБЕ ЗА ЎРАДЖАЙ
КАЛГАС НАБІРАЕ СІЛЫ
КАЛІНІНЦЫ НА СЯЎБЕ

У большасці калгасаў веснавыя работы былі на той час ужо завершаны. Напрыклад, у сельгасарцелі «Бальшавік», якая знаходзілася пад кіраўніцтвам калгаснага садавода таварыша Гардзейчыка, было агледжана 50 гектараў саду. «**Упарадкавалі свой сад і калгаснікі сельгасарцелі «Колас». Калгасны садавод тав. Меньшык дабіваецца атрымання ўжо ў гэтым годзе высокіх ураджаяў садавіны», — пісала «Звязда».**

У доглядзе дапамагалі і школьнікі. Яны прыходзілі пасля ўрокаў у сад і працавалі каля дрэў па дзве гадзіны.

«**За вясну ў калгасных садах пасаджана ўжо каля 8 тысяч дзічак і звыш 3 гектараў клубнікі. Калгасы набылі вапну і ўжо распачалі пабелку пладовых дрэў».**

Восенню ў Хойніцкім раёне планавалі атрымаць 30 тысяч саджанцаў мічурынскіх сартоў з гадавальніка, што ў Разанскай вобласці. Апрача таго, райаддзел імкнуўся закупіць у Крыме 4-5 тысяч чаранкоў розных сартоў вінаграду.

«**На пладовых дрэвах ужо набухлі почкі. Хутка зазеленеюць і зацвітуць усе калгасныя сады. Ёсць меркаванні, што ў гэтым годзе будзе вялікі ўраджай садавіны», — пісала «Звязда».**

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**




# АСІПОВІЧЫ. ДЗЁРЗКІЯ ДЫВЕРСІІ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ

**Першае, што бачыць пасажыр з акна цягніка, які прыбывае на чыгуначную станцыю Асіповічы, — абеліск з бюстам аднаго з самых яскравых тутэйшых барацьбітоў з карычневай навалай Фёдара Крыловіча. У метале ён грозны і непадступны: цвёрды позірк, валявы твар — сапраўдны сімвал непахіснасці і мужнасці.**



## АСАБІСТЫ ВОРАГ ГІТЛЕРА

Падрабязней пра славутага земляка і не толькі раскажуць у Асіповіцкім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі, які зусім блізка ад чыгуначнага вакзала. Адразу ж стане зразумела, за што Асіповічы атрымалі летась вымпел «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

— Нашых партызан і падпольшчыкаў немцы баяліся як агню, — расказвае **малодшы навуковы супрацоўнік музея Леанід АСТРЭЙКА**. — Фёдар Крыловіч быў асабістым ворагам Гітлера. Ён здзейсніў найбуйнейшую сухапутную дыверсію за ўсю гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Пры дапамозе дзвюх магнітных мін знішчыў чатыры варожыя эшалоны.



Падпольшчык Фёдар Крыловіч падчас акупацыі раёна працаваў электраманцёрам на чыгуначнай станцыі. 30 ліпеня 1943 года ён атрымаў заданне ўзарваць воінскі эшалон з палівам, які павінен быў адправіцца на Курск. Каб здзейсніць яго, народны мсцівец спачатку вывеў са строю святлафор, які знаходзіўся непадалёк ад саставу. Немцы адправілі Крыловіча рамантаваць яго ў суправаджэнні салдат. І ён змог непрыкметна паставіць міны на першы і апошні вагоны цягніка. Але насуперак чаканням эшалон адправілі не на фронт, а на запасныя шляхі, дзе ўжо стаялі іншыя саставы з боепрыпасамі і ваеннай тэхнікай. Пасярод ночы Асіповічы скалануліся ад жудаснага выбуху — спрацавалі пастаўленыя Крыловічам міны.

— Выбух быў такі, што калёсныя пары адляталі на некалькі кіламетраў, — апісвае гід. — Пачалася сумятня, хаос. Полымя перакінулася на суседнія эшалоны, у паветра ляцела перадавая нямецкая тэхніка, новыя танкі «Тыгр».

Па інфармацыі, якая захоўваецца ў музеі, у тым агні згарэлі 63 вагоны з боепрыпасамі і авіябомбамі, пяць танкаў «Тыгр», тры танкі Л-10, сем бронемашын, 23 платформы з бензінам, восем цыстэрн з аўтамаслам, дванаццаць вагонаў з прадуктамі. Акрамя гэтага, быў знішчаны кран для падачы вугалля і вугальны склад. Пажар працягваўся некалькі гадзін. Ахоўнікі лагера для ваеннапалонных, які знаходзіўся непадалёк, разбегліся, і зняволеныя мелі магчымасць уцячы і папоўніць рады партызан.

— Вынікі дыверсіі ў Асіповічах дайшлі да стаўкі Гітлера, — расказвае Астрэйка. — Яна каштавала некалькім генералам воінскай пасады. Фёдар Крыловіч заставацца ў горадзе болей не мог, ён далучыўся да партызан і працягнуў барацьбу з ворагам у складзе разведвальна-дыверсійнай групы. Яму пашчасціла ацалець. У 1949 годзе за гэты подзвіг герою быў уручаны ордэн Леніна. Імем мужнага падпольшчыка назвалі асіповіцкую СШ № 5, якая нядаўна была пабудавана.

## СЯСТРА ХАТЫНІ

Былая жыхарка спаленай карнікамі асіповіцкай вёскі Вялікая Гарожа Марыя Цімінская калісьці расказвала карэспандэнту «Звязды», як цудам пазбегла страшнай смерці. На яе вачах загінулі амаль усе яе родныя і аднавяскоўцы. Фота жанчыны, якая на момант страшнай трагедыі была зусім яшчэ дзіцём, і яе бацькоў размешчана на адным з музейных стэндаў, прысвечаных генацыду. Асіповіцкі раён стаў другім пасля Кіраўскага з яго шматпакутлівымі Боркамі па колькасці спаленых мірных грамадзян.




— Было знішчана больш чым 80 вёсак, — сведчыць суразмоўнік. І дэманструе важкую папку, перададзеную раённай пракуратурай, дзе пайменна прыводзяцца спісы расстраляных, закатаваных, спаленых жыўцом месцічаў.

## ГЕРОЯМІ СТАНАВІЛІСЯ Ў 14 ГАДОЎ

Рыма Кунько пайшла ў партызаны ўслед за братамі, калі ёй было ўсяго 14 гадоў. Дзяўчынка марыла стаць падрыўніком, але яе жаданне ніхто сур'ёзна не ўспрымаў. Рыма ж была ўпартай і вельмі здольнай. Яна добра засвоіла ўрокі падрыўніка Барыса Дзмітрыева, якога закінулі з Расіі ў Асіповіцкі край для барацьбы з ворагам. І хоць яны праводзіліся для больш вопытных партызан, юная патрыётка наведвала іх употай.

— Аднойчы Рыма цішком узяла часткі ўзрыўчаткі і ў адзіночку пайшла падрываць варожы цягнік, — расказвае Леанід Астрэйка. — Трое сутак сядзела ў засадзе ў стозе сена, чакала і ўрэшце падарвала. Калі вярнулася да партызан і расказала пра гэта, ёй спачатку не паверылі. Але яна паказала тое месца, і ўжо ні ў кога не было сумнення. Хутка дзяўчына стала кіраўніком падрыўной групы, у склад якой увайшлі яе сяброўкі. Называлася гэта група «8 сакавіка». У 1944 годзе ў Брыцалавічах партызанскі атрад, дзе ваявала Рыма, сутыкнуўся з вялікім нямецкім падраздзяленнем. Прыкрываючы атрад, мужная дзяўчына загінула. Яна пахавана ў Асіповічах у брацкай магіле партызан. Подзвіг Рымы Кунько адзначаны пасмяротна ордэнам Айчыннай вайны І ступені. Адна з вуліц Асіповічаў носіць яе імя, а на будынку Ліпеньскай сярэдняй школы, дзе вучылася патрыётка, устаноўлена мемарыяльная дошка ў яе гонар.

У той жа брацкай магіле, дзе пахавана Рыма Кунько, ляжыць і яе настаўнік па падрыўной справе — масквіч Барыс Дзмітрыеў. У складзе партызанскага атрада № 211 ён ваяваў са студзеня 1943 года. Паспеў падрыхтаваць 14 партызан-падрыўнікоў, узяў удзел у падрыве 18 варожых эшалонаў. Дыверсійныя групы на чале з Барысам Дзмітрыевым узарвалі 1400 чыгуначных рэек, 43 масты, 22 аўтамашыны, тры танкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*г. Асіповічы.*

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1: Цех подсобных промыслов** (инв. № 420/С-101787, **206,7 кв. м**). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Огородники, ул. Новая, 1Г**

***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,0252 га предоставлен на праве аренды до 08.11.2071 для строительства и обслуживания здания цеха подсобных промыслов

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 30 678,76 бел. руб.** (снижена на 15 %)

**Лот № 2: Здание бани** (инвен. №: 430/С-61953, **45,2 кв. м**). Адрес: **Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 50, здание бани юго-западнее д. Василевичи**

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0691** га предоставлен на праве аренды по 29.07.2072 для строительства и обслуживания здания бани. Ограничения (обременения): придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильных дорог

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 462,84 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет покупатель

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере по лот № 1 – 6 %, по лоту № 2 – 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

Предыдущие публикации извещения в газете «Звязда»: по лоту № 1 – 15.03.2025, по лоту № 2 – 21.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.05.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет**
извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Ильинка, ул. Тенистая, д. б/н (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 4 х 10 м.

Площадь: 36,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1957 года постройки.

Материал стен: деревянный.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Одноквартирный блокированный жилой дом находится в аварийном состоянии.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник – Щербина Варвара Михайловна, умерла 12.07.2010 г.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 20 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**

УНП 600092462

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области**
**д. Ильинка, ул. Тенистая, д. б/н**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Ильинка, ул. Тенистая, д. б/н (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Щербина Варвара Михайловна, умерла 12.07.2010 г.

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: 8 01715 62332, 801715 62333 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: 223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.

УНП 600092462

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# АСНОВА ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ

## Высокая якасць па даступных цэнах

У Беларусі на працягу ўжо многіх гадоў у прыярытэце харчовая бяспека. Гэтая стабільнасць падтрымліваецца ў нас дзякуючы ўласнай вытворчасці і даступнасці для насельніцтва прадуктаў высокай якасці па сацыяльна справядлівых цэнах, лічыць намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі Святлана КАНДРАЦЕНКА.



## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПЫТАННІ

У нашай краіне найважнейшыя пытанні, звязаныя з забеспячэннем харчовай бяспекі, падтрымкай і развіццём аграрнай галіны, знаходзяцца на кантролі кіраўніка дзяржавы, лічыць спецыяліст. Пад кіраўніцтвам Прэзідэнта наша краіна прайшла складаны шлях — ад адраджэння вёскі і аднаўлення вытворчага патэнцыялу, пачынаючы з першых дзяржаўных праграм і крокаў па мадэрнізацыі і інтэнсіфікацыі галін, да стварэння сучаснага аблічча высокатэхналагічнага айчыннага аграпрамысловага комплексу, які заняў трывалыя пазіцыі на сусветным рынку харчавання.

Толькі за апошнія 20 гадоў вытворчасць збожжа ў краіне павялічылася больш чым у 1,5 раза, цукровых буракоў — больш чым у 2,5 раза, малака — амаль у 2 разы. Узровень самазабеспячэння па бульбе складае 111 %, гародніне і бахчавых — 103 %, мясу — 135 %, малаку — 283 %, яйках — 123 %.

У разліку на аднаго жыхара ў год у краіне вырабляецца 305 кг гародніны, 438 кг бульбы, 908 кг малака, 139 кг мяса, 70 кг пладоў і ягад, 375 яек. Для параўнання: сярэднім па ЕАЭС у разліку на аднаго жыхара ў год прыпадае 275 кілаграмаў малака, 78 кг мяса, 302 яйкі.

Па выніках мінулага года ўнёсак сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі ў ВУП краіны склаў 6,9 %. У аграрную галіну накіравана 14,6 % ад агульнага аб'ёму інвестыцый у асноўны капітал.

## ПА ВЫНІКАХ МАНІТОРЫНГУ

Па даручэнні Прэзідэнта ў 2003 годзе навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук сумесна з урадам была распрацавана канцэпцыя нацыянальнай харчовай бяспекі, а ў 2017 годзе — дактрына. Штогод да 1 ліпеня НАН і непасрэдна Інстытут сістэмных даследаванняў у АПК выконвае маніторынг харчовай бяспекі, вынікі якога накіроўваюцца ва ўрад і ўсім зацікаўленым дзяржорганам для прыняцця рашэнняў.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца аналізу і прагназаванню сусветных тэндэнцый. Гэта неабходна для таго, каб аператыўна рэагаваць на знешнія выклікі харчовай бяспекі і ў цэлым планаваць выгадныя для нашай краіны стратэгіі знешнеэканамічнай дзейнасці.

Асноўныя паказчыкі стабільнасці ўнутранага рынку краіны — даступнасць і высокі ўзровень спажывання прадукцыі на душу насельніцтва, а таксама рост долі айчынных тавараў у таваразвароце, адзначыла эксперт інстытута. Па шэрагу значных таварных пазіцый удзельная вага айчыннай прадукцыі складае 100 %, гэта цукар, малочныя прадукты, мяса і мясныя прадукты. Па іншых катэгорыях долю рынку за апошнія некалькі гадоў удалося істотна нарасціць у выніку сур'ёзнай працы беларускіх прадпрыемстваў па імпартазамяшчэнні. Напрыклад, доля свежых яблыкаў беларускай вытворчасці за апошнія тры гады павялічылася на 24,6 %, агуркоў — на 17 %, таматаў — на 11,1 %, цыбулі — на 6,7 %.

Даказана навукай і праверана практыкай, што павелічэнне долі айчынных таваравытворцаў на ўнутраным рынку станоўча адбіваецца і на іх эканоміцы, і на харчовай бяспецы насельніцтва.

## СПРЫЯЛЬНЫЯ ТРЭНДЫ

Асаблівая ўвага ў краіне ўдзяляецца харчаванню дзяцей і вытворчасці прадуктаў дзіцячага харчавання. Моцны пачатак быў пакладзены ў прэзідэнцкіх праграмах «Дзеці Беларусі», далей — шэраг дзяржаўных галіновых навукова-тэхнічных праграм, рэалізацыя якіх дазволіла мадэрнізаваць беларускія прадпрыемствы і вывесці галіну на інавацыйны шлях развіцця.

Айчынныя вытворцы прадуктаў дзіцячага харчавання выпускаюць дастатковы для патрэб унутранага рынку асартымент. Летась доля продажу айчыннага дзіцячага харчавання на беларускім рынку склала 75 %, у тым ліку: сухія дзіцячыя сумесі і кашы — 67,5 %, мясныя і рыбныя кансервы — 90 %, плодаагародніння кансервы і сокавая прадукцыя — 75,8 %.

Дасягнуты ўзровень вытворчасці прадукцыі не толькі гарантуе стабільнасць унутранага рынку і даступнасць прадуктаў харчавання для насельніцтва, але і дазваляе фарміраваць экспартны патэнцыял і рабіць важкі ўнёсак у эканоміку краіны.

Беларусь стабільна ўваходзіць у топ-5 экспарцёраў малакапрадуктаў і топ-15 — экспарцёраў мяса і мясапрадуктаў. Святлана Кандраценка падкрэсліла, што кан'юнктура сусветнага рынку складваецца спрыяльна для айчынных вытворцаў: попыт на прадукты харчавання расце, з'яўляюцца новыя вельмі выгадныя нішы.

З улікам таго, што ў свеце набірае абароты трэнд на здаровы лад жыцця, нашы прадукты цалкам упішуцца ў меню жыхароў многіх краін — нават самых патрабавальных да бяспекі і якасці, лічыць эксперт. Першачарговая задача для краіны — нарасціць канкурэнтныя перавагі буйных нацыянальных брэндаў, актыўна прасоўваць і пазіцыянаваць сваю прадукцыю, пашыраць геаграфію паставак, асвойваць новыя прадукты, забяспечыць глыбокую перапрацоўку сыравіны на аснове сучасных тэхналогій.

Вялікае значэнне мае навуковае забеспячэнне, паколькі новыя веды, тэхналогіі і кампетэнцыі — гэта высокаўраджайныя сарты і гібрыды сельскагаспадарчых культур, пароды жывёл і птушкі, сістэмы дакладнага земляробства і лічбавыя тэхналогіі ў жывёлагадоўлі, новыя метады забеспячэння бяспекі вытворчасці, біятэхналогіі і глыбокая перапрацоўка сыравіны, навукова абгрунтаваныя прагнозы і маркетынгавыя стратэгіі.

Дзяржава ўсебакова падтрымлівае развіццё неабходных навуковых даследаванняў і распрацовак, а таксама стымулюе інавацыйную дзейнасць таваравытворцаў. Наяўнасць і прымяненне ўласных прарыўных тэхналогій і інавацый у вытворчасці ў перспектыве будзе залогам паспяховай канкурэнцыі на сусветным рынку харчавання.

**Сяргей КУРКАЧ.**




**ОАО «НАФТАН»** реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

| № лота | Наименование | Инв. номер | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| *гр. 1* | *гр. 2* | *гр. 3* | *гр. 4* | *гр. 5* |
| 1 | Цистерна съемная 2 м³ | 06273326 | 8 324,00 | 9 988,80 |
| 2 | Цистерна съемная 2 м³ | 06273327 | 8 324,00 | 9 988,80 |
| 3 | Резательная машина | 195111 | 1 688,00 | 2 025,60 |
| 4 | Резательная машина | 195112 | 1 688,00 | 2 025,60 |
| 5 | Резательная машина МРБ-100 | 195349 | 6 816,00 | 8 179,20 |
| 6 | Экструзионная линия «Арсенал-1600Е» | 196797 | 112 564,00 | 135 076,80 |
| 7 | Установка рукавной пленки УРП-1500-3 | 192490 | 33 648,00 | 40 377,60 |
| 8 | ШКАФ УПР. ЭЛ/ПРИВОДОМ ШУЭ1-2,2 IP54 2,2 кВт | 197261 | 528,00 | 633,60 |
| 9 | ШКАФ УПР.ЭЛ/ПРИВОДОМ ШУЭ1-2,2 IP54 2,2 кВт | 197262 | 528,00 | 633,60 |
| 10 | ШКАФ УПР.ЭЛ/ПРИВОДОМ ШУЭ1-75 IP54 75 кВт | 197268 | 3 824,00 | 4 588,80 |
| 11 | Нагнетатель сернистого газа Н 700-13-1 | 06283787 | 521 600,00 | 625 920,00 |
| 12 | НАСОС ХП-16 ХП-160/49 | 06138319 | 2 364,00 | 2 836,80 |
| 13 | НАСОС ХП-16 ХП-160/49 | 06138320 | 2 364,00 | 2 836,80 |
| 14 | НАСОС ХП-16 ХП-160/49 | 06138321 | 2 364,00 | 2 836,80 |
| 15 | НАСОС ХП160/49 эл./дв. Н-46/3 | 06250453 | 6 096,00 | 7 315,20 |
| 16 | НАСОС ХП 160/49 Н42/1 дв. 4АМ | 06250289 | 6 048,00 | 7 257,60 |
| 17 | НАСОС ХП 160/49 Н42/2 дв.4АМ | 06250288 | 6 064,00 | 7 276,80 |
| 18 | НАСОС ХП-160-49-20 С ЭЛ. ДВИГ.4 | 06152847 | 3 996,00 | 4 795,20 |
| 19 | НАСОС ХП-160-49-20 С ЭЛ. ДВИГ.4 | 06152848 | 3 996,00 | 4 795,20 |
| 20 | НАСОС ХП-160-49-20 С ЭЛ. ДВИГ.4 | 06152849 | 3 996,00 | 4 795,20 |
| 21 | НАСОС-ХП-160/49 С Э/ДВ. Н46/1 | 06250084 | 4 004,00 | 4 804,80 |
| 22 | НАСОС-ХП-160/49 С Э/ДВ. Н46/2 | 06250083 | 4 004,00 | 4 804,80 |

| № лота | Наименование | Инв. номер | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| 23 | Пневматический буйковый уровнемер 167LP32RSRC3 | 08411296 | 2 504,00 | 3 004,80 |
| 24 | Пневматический буйковый уровнемер 167LP32RSRC3 | 08411297 | 2 504,00 | 3 004,80 |
| 25 | Пневматический буйковый уровнемер 167LP32RSRC3 | 08411298 | 2 504,00 | 3 004,80 |
| 26 | Пневматический буйковый уровнемер 167LP32RSRC3 | 08411299 | 2 504,00 | 3 004,80 |
| 27 | Пневматический буйковый уровнемер 167LP32RSRC3 | 08411300 | 2 504,00 | 3 004,80 |
| 28 | СТАНОК ВЕРТ. 2А-135 | 06138384 | 1 540,00 | 1 848,00 |
| 29 | СТАНОК ВЕР./ МН-18 СЛЕСАРКА | 15151024 | 796,00 | 955,20 |
| 30 | ТЕПЛООБМЕННИК ТГ-КТ1200/1В-37-195 | 06272204 | 31 896,00 | 38 275,20 |
| 31 | ТЕПЛООБМЕННИК ТГ-КТ1200/1В-37-195 | 06272205 | 31 896,00 | 38 275,20 |
| 32 | ТЕПЛООБМЕННИК ТГ-КТ1200/1В-37-195 | 06272206 | 31 848,00 | 38 217,60 |
| 33 | ТЕПЛООБМЕННИК ТГ-КТ1200/1В-37-195 | 06272207 | 31 848,00 | 38 217,60 |
| 34 | ТЕПЛООБМЕННИК ТГ-КТ1200/1В-37-195 | 06272208 | 32 060,00 | 38 472,00 |
| 35 | ТЕПЛООБМЕННИК ТГ-КТ1200/1В-37-195 | 06272209 | 32 060,00 | 38 472,00 |
| 36 | Теплообменник ТГ-КТ1200/1В-37-195 | 06272263 | 46 764,00 | 56 116,80 |
| 37 | Теплообменник ТГ-КТ1200/1В-37-195 | 06272264 | 46 764,00 | 56 116,80 |
| 38 | ТЕПЛООБМЕННИК/ ТГ-КТ1400/ Т-26/2 | 06252553 | 7 112,00 | 8 534,40 |
| 39 | Графитовый теплообменник ТГ-КТ1200 | 06282364 | 21 208,00 | 25 449,60 |
| 40 | Графитовый теплообменник ТГ-КТ1200 | 06282369 | 21 208,00 | 25 449,60 |
| 41 | Графитовый теплообменник ТГ-КТ1200 | 06282370 | 21 208,00 | 25 449,60 |
| 42 | Электродвигатель Э.5А225М4У1 55 кВт | 04152290 | 1 844,00 | 2 212,80 |

| № лота | Наименование | Инв. номер | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| 43 | Электродвигатель Э.5А225М4У1 55 кВт | 04152291 | 1 844,00 | 2 212,80 |
| 44 | Электродвигатель Э.5А250S4У1 75 кВт | 04152292 | 2 408,80 | 2 890,56 |
| 45 | Пневматический преобразователь дифференциального давления Y/13A-MS4/NAS-FP с вентильным блокам | 08412714 | 1 673,00 | 2 007,60 |
| 46 | Пневматический преобразователь дифференциального давления Y/13A-MS4/NAS-FP с вентильным блокам | 08412715 | 1 673,00 | 2 007,60 |
| 47 | Пневматический преобразователь дифференциального давления Y/13A-MS4/NAS-FP с вентильным блокам | 08412716 | 1 673,00 | 2 007,60 |
| 48 | Теплообменник Т-83/4 | 06274569 | 13 570,00 | 16 284,00 |
| 49 | НАСОС ХП160 ХП160/49 Н51/3 | 06138339 | 2 200,00 | 2 640,00 |
| 50 | НАСОС ХП160 ХП160/49 Н55/1 4АМ | 06138338 | 2 200,00 | 2 640,00 |
| 51 | АВТОМАТ. ВЫКЛЮЧАТЕЛЬ ЭЛЕКТРОН | 04150336 | 345,00 | 414,00 |
| 52 | АВТОМАТ. ВЫКЛЮЧАТЕЛЬ ЭЛЕКТРОН | 04150337 | 345,00 | 414,00 |
| 53 | ТЕПЛООБ. КОЖУХОТР. 83/3 | 06138354 | 32 040,00 | 38 448,00 |
| 54 | ТЕПЛООБМЕННИК-Т-6/1 | 06256435 | 23 750,00 | 29 760,00 |

**Состояние удовлетворительное.**

**Предложения принимаются по адресу:**
**211441, г. Новополоцк, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30**
**по местному времени 15 мая 2025 года**
**с пометкой на конверте «Реализация неликвидов, 15.05.2025»**
**либо в электронной форме на e-mail: tender.box@naftan.by**
**с вышеуказанной пометкой.**
**Извещение на проведение конкурса размещены на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42.**

УНП 300042199



# БОЛЬШ ЗА МІЛЬЁН ГАСЦЕЙ

## Якім быў мінулы год для турыстычнай Гродзеншчыны і чым вобласць парадуе вандроўнікаў у новым сезоне?

У 2024 годзе больш за адзін мільён чалавек наведалі Гродзеншчыну. Сярод іх былі як замежныя турысты, так і вандроўнікі з іншых рэгіёнаў Беларусі. Пра гэта «Звяздзе» паведаміў начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Максім МАЛАХОЎСКІ.

### АДКРЫТАСЦЬ І ГАСЦІННАСЦЬ

Наша краіна адкрыта — бязвізавы рэжым дзейнічае для больш як 70 краін, з іх 38 — еўрапейскія. Не так даўно з'явілася электронная віза, якую можна адкрыць анлайн.

***— Нягледзячы на няпростую палітычную сітуацыю ў свеце, Беларусь застаецца гасціннай краінай,*** — кажа Максім Малахоўскі. — ***Напрыклад, сейм Латвіі падтрымаў папраўкі ў законе аб турызме. Згодна з імі, пастаўшчыкам турыстычных паслуг будзе забаронена арганізоўваць туры ў Беларусь, абмежаванне распаўсюдзіцца і на Расію. Калі б наш кірунак не карыстаўся папулярнасцю, наўрад ці зайшла б гаворка пра падобныя змены. Але індывідуальныя вандраванні ніхто не адмяняў, так што чакаем усіх у госці.***

### ТУРЫСТЫЧНЫ КАЛЕЙДАСКОП

***— Мне як кіраўніку вельмі цікава, што думаюць госці аб нашай вобласці. І многія адзначаюць, што з году ў год вяртаюцца да нас, рэкамендуюць Гродзеншчыну сябрам. У нас шмат эксклюзіву. Адзіная лютэранская кірха, старадаўні гадзіннік на Фарным касцёле, два замкі толькі ў адным Гродне, а па вобласці колькі цікавых мясцін і сядзіб! Сапраўдны турыстычны калейдаскоп,*** — дзеліцца прадстаўнік аблвыканкама.

Унікальная прырода спрыяе развіццю экатурызму. Аўгустоўскі канал не страчвае свайго статусу жамчужыны Прынёманскага краю. Тут сплаўляюцца на байдарках і сапбордах, працуюць два цеплаходы, распрацаваны веламаршруты. У мінулым годзе адзначылі 200-годдзе з пачатку будаўніцтва беларускай часткі канала. Напярэдадні гэтай падзеі прайшоў шэраг рэканструкцый і абнаўленняў, так што гасцям будзе яшчэ больш камфортна бавіць тут час. А яшчэ ёсць Ліпічанская і Белавежская пушчы, рака Шчара, заказнік «Азёры». Спіс вельмі вялікі!

***— У топе і рэлігійны турызм. На тэрыторыі Гродзеншчыны шмат унікальных святынь, а своеасаблівым цэнтрам з'яўляецца Жыровіцкі манастыр,*** — нагадвае Максім Малахоўскі. — ***Рэстаўрацыйныя работы, якія вядуцца там, амаль скончаны, і зусім хутка ён адчыніць свае дзверы вернікам і турыстам у абноўленым выглядзе. Не губляе сваёй актыўнасці прамысловы кірунак. Турысты з вялікім задавальненнем наведваюць вытворчыя флагманы, напрыклад, Лідскі піваварны завод, «Лідахарчканцэнтраты», шклозавод «Нёман». Экскурсіі распісаны на месяцы наперад. Не пустуюць нашы аграсядзібы. Іх у вобласці 274, яны ўносяць вялікі ўклад у прыцягненне турыстаў.***

Аздараўленчы турызм таксама не адчувае недахопу гасцей. У санаторыі едуць з самых розных краін. Пераважна гэта Расія, але ёсць госці з ЗША і Ізраіля. Назіраецца тэндэнцыя аб'яднання аздараўленчага турызму з медыцынскім. Санаторыі прапаноўваюць праграмы абследаванняў у клініках.





### АД «ІЎЕЎСКАГА ПАМІДОРА» ДА ЧЭМПІЯНАТУ Ў КЛАСЕ ЭНДУРА

У кожным раёне ёсць брэндавыя мерапрыемствы. Паспелі заваяваць папулярнасць «Іўеўскі памідор», «Бацькава булка» ў Свіслачы, LIDBEER, «Ганненскі кірмаш» у Зельве і многія іншыя. На прыцягненне турыстаў працуюць і спартыўныя мерапрыемствы, якія вабяць з году ў год нямала прыхільнікаў. Напрыклад, «Гарадзенская вандроўка», якая сцірае ўсе межы. Едуць як з блізкага, так і далёкага замежжа, нягледзячы на сітуацыю ў свеце, бо спорт і любоў да здаровага ладу жыцця аб'ядноўваюць. У мінулым годзе рэгістрацыю закрылі ўжо праз два тыдні. У гэтым — падрыхтаваліся і пашырылі колькасць удзельнікаў, чакаецца каля 1500 бегуноў.

***— У Ваўкавыску другі раз прайшло непаўторнае мерапрыемства, якое ўжо можна назваць брэндавым. Адкрыты мотачэмпіянат Беларусі ў класе эндура. Ён праходзіць у маляўнічым месцы паблізу краснасельскіх кар'ераў, якія празвалі беларускімі Мальдзівамі,*** — інфармуе начальнік упраўлення спорту і турызму.

Нягледзячы на тое што ў мінулым годзе спаборніцтвы прайшлі ўпершыню, сабралася больш за 400 спартсменаў, а з імі — сем'і, сябры. Мерапрыемства атрымалася не менш маштабным і сёлета.

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПРАЕКТ

Як падкрэсліў Максім Малахоўскі, поспех і добрая работа турыстычнай сферы магчымыя толькі дзякуючы ўзаемадзеянню розных сфер. Турыстычны прадукт ставарае далёка не толькі ўпраўленне. Поспех залежыць ад пунктаў грамадскага харчавання, аб'ектаў культуры, забаў, гідаў і, канешне, ад кіраўніцтва вобласці і раёнаў. Многае залежыць у цэлым ад добраўпарадкавання.

Вялікая зацікаўленасць у Гродзенскай вобласці стымулюе работу па развіцці і ўдасканаленні турыстычнай інфраструктуры. Уздоўж трасы М6 удала размечаны аб'екты турыстычнага арыентавання. Стаіць задача распаўсюдзіць гэты прыклад на ўсе раёны. Будуць удасканальвацца запраўчныя станцыі, абсталёўвацца санвузлы, адкрывацца пункты харчавання.

Таму Гродзеншчына з лёгкасцю ўключылася ў работу над турыстычнай сферай як над нацыянальным праектам.

**Аліса ВОЎК.**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ОБЪЕКТА СТРОИТЕЛЬСТВА

«Возведение многоквартирного жилого дома со сносом капитальных строений с инвентарными номерами 500/С-28900, 500/С-28148, 500/С-28901 по ул. Ф. Скорины, 51Б»

**Информация о Застройщике**

ОАО «АГАТ-СИСТЕМ» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 23.02.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100230470.

Юридический адрес: 220084, г. Минск, ул. Ф. Скорины, 51Б, тел. 285-93-33.

Режим работы: понедельник – четверг с 8.00 до 17.00, пятница с 8.00 до 15.45, обеденный перерыв с 12.00 до 12.45, выходные дни – суббота, воскресенье.

Заключение договоров осуществляется: по адресу: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 51Б, каб. 108, тел.: 285-93-33, 8 (029) 125-28-31.

**Информация об объекте строительства**

Строительство многоквартирного жилого дома осуществляется в г. Минске по ул. Ф. Скорины, 51Б на земельном участке, принадлежащем ОАО «АГАТ-СИСТЕМ» (свидетельство от 21.08.2023 № 500/1973-3460 о государственной регистрации), на основании полученной разрешительной документации:

- Решения Минского городского исполнительного комитета от 14.12.2017 г. № 4190 «О разрешении проведения проектно-изыскательских работ»;
- Решения Минского городского исполнительного комитета от 30.11.2023 г. № 4855 «О разрешении строительства»;
- проектно-сметной документации, прошедшей государственную экспертизу (заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.04.2023 № 78-15/23, от 10.04.2025 № 111-15/25);
- договора строительного подряда на строительство жилого дома, заключенного с ОДО «Экология города» от 10.01.2024 № 25-С/23;
- извещения от 26.02.2024 № 06/78 о получении уведомления о регистрации объекта строительства инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску 26.02.2024 № 2-206Ж-012/24.

**Сведения об этапах и сроках строительства**

Срок начала строительства жилого дома – февраль 2024 года.

Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства жилого дома и ввода его в эксплуатацию – март 2026 года.

Проектом предусмотрено строительство двухсекционного 19-этажного крупнопанельного жилого дома серии М 111-90 ОАО «МАПИД». В уровне техподполья под лоджиями запроектированы холодные кладовые (погреба).

На первом этаже запроектированы лестнично-лифтовой блок с двумя лифтами грузоподъемностью 1000 кг и 450 кг. Квартиры запроектированы с полной планировкой, организованы жилые помещения, прихожие, кухни, санузлы, ванные комнаты, лоджии, выносные кухни в 2, 3-комнатных квартирах с устройством лоджии с 4-го этажа. Окна, балконные двери выполняются из ПВХ профиля с поворотно-откидной системой открывания одной из створок в оконном блоке, кроме оконных блоков с балконными дверями. Окна и балконные двери оборудованы детскими замками безопасности. Мусоропровод не предусмотрен.

Общая площадь квартир объекта составляет 15 312,09 кв. метра.

Квартиры сдаются без отделки.

Санитарно-техническое оборудование: унитаз, раковина.

Межквартирные лестничные клетки и коридоры, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, крыша, технический этаж, подвал (техническое подполье), другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, санитарно-техническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, помещение товарищества собственников, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного жилого дома, являются общим имуществом, поступают в общую долевую собственность

**Комплексное благоустройство территории**

Предусмотрено строительство двухуровневого открытого гаража-стоянки на 207 машино-мест.

Устройство проездов и тротуаров, площадки для мусорных контейнеров, велопарковки (крытая), детской площадки, автомобильных парковок, установка скамеек, урн, озеленение территории.

Для заключения договоров долевого строительства с работниками по направлениям от организаций – Открытое акционерное общество «АГАТ – системы управления» – управляющая компания холдинга «Геоинформационные системы управления», ОАО «НИИ ЭВМ», ОАО «Агат – электромеханический завод» и ОАО «Техника связи» – предлагается 130 квартир и 130 машино-мест, в том числе:
однокомнатная метражом 44,97 – 46,76 – 16 квартир;
двухкомнатная метражом 44,36 – 55,31 – 36 квартир;
трехкомнатная метражом 60,57 – 64,22 – 62 квартиры;
трехкомнатная метражом 78,05 – 81,70 – 16 квартир.
Машино-место метражом 12,5 – 110 мест;
машино-место метражом 13,5 – 10 мест;
машино-место метражом 14,5 – 10 мест.

**Объект долевого строительства** – квартира с машино-местом.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются 130 (сто тридцать) квартир без выполнения внутренних отделочных работ на 1-19-м этажах в жилом доме и с машино-местом в двухуровневом гараже-стоянке.

Строительство осуществляется в соответствии с нормами Указа Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь».

**Условия оплаты**:

| Тип квартиры | Стоимость квадратного метра квартиры при 100 % внесении денежных средств, бел. рублей | Стоимость квадратного метра квартиры при рассрочке платежа, бел. рублей |
|---|---|---|
| Однокомнатная | 2 944,0 | 3 060,0 |
| Двухкомнатная | | |
| Трехкомнатная метражом 60,57 – 64,22 | | |
| Трехкомнатная метражом 78,05 – 81,70 | | |

| Площадь машино-места, м² | Стоимость квадратного метра машино-места, бел. рублей |
|---|---|
| Машино-место метражом 12,5 | 2 861,81 |
| Машино-место метражом 13,5 | |
| Машино-место метражом 14,5 | |

При рассрочке платежа первоначальный взнос 60 % стоимости квартиры, 50 % стоимости машино-места. Оставшаяся стоимость – ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства.

Финансирование элементов благоустройства территории и инженерно-транспортной инфраструктуры производится участниками строительства жилого дома и многоуровневого гаража-стоянки, вводимых в эксплуатацию в составе объекта.

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 9.00 23.04.2025 года до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего задекларированному количеству объектов долевого строительства, **по адресу: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 51Б, каб. 108.**

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ОАО «АГАТ-СИСТЕМ» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Договор создания объекта долевого строительства заключается в редакции Застройщика, согласованной в местном исполнительном и распорядительном органе.

# ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14.
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15.
vtb.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 31 марта 2025 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 49 300 | 55 256 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 282 267 | 343 862 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 398 589 | 303 662 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 191 028 | 215 781 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 569 342 | 1 638 928 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 1 059 | 152 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2 296 | 2 296 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 93 561 | 91 736 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 50 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 4 693 | 4 679 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 143 | 143 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 11 541 | 19 981 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 2 603 869 | 2 676 476 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 174 600 | 87 989 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 1 614 596 | 1 853 314 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 48 344 | 9 655 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 66 | 143 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 128 755 | 105 506 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 966 361 | 2 056 607 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 117 562 | 117 562 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 3 432 | 3 432 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 62 213 | 53 910 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 25 676 | 25 791 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 428 625 | 419 174 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 637 508 | 619 869 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 2 603 869 | 2 676 476 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ Январь – март 2025 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 78 577 | 67 899 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 42 659 | 32 938 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 35 918 | 34 961 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 18 392 | 12 605 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 452 | 1 553 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 16 940 | 11 052 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 7 | 4 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 20 492 | 9 009 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4 352 | 202 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 31 634 | 2 498 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 051 | 2 391 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 24 650 | 27 336 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 644 | 524 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 21 832 | 27 261 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 4 192 | 5 949 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 17 640 | 21 312 |

Председатель Правления В.К. Лиходиевский

Главный бухгалтер Л.Д. Левданская

Дата подписания: 07 апреля 2025 г.

УНП 101165625

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |
